Москва
Старая Площадь 4 ЦК ВКП(б) Орг. Инстр. Отдел
на 1934 г. Звезда—1

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 276 (5109)
СНЕЖНЯ
10
ПАНЯДЗЕЛАК
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

5 ТЫСЯЧ ВОЙСК БУДЗЕ ПАСЛАНА У СААР

ПАРЫЖ, 8 снежня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення агенцтва Гавас, пасля адбыўшагося закрытага пасяджэння совета Лігі нацый можна думаць, што ў Саарскую вобласць будуць пасланы войскі колькасцю ў 5 тысяч чалавек. Англія і Італія пашлюць па адному батальёну. Апрача таго, у Саарскую вобласць будзе накіраван адзін змешаны галандска-шведскі батальён. Совет Лігі распырыў «камітет трох», уключыўшы ў яго па адному прадстаўніку ад кожнай краіны, якая пасылае свае войскі ў Саарскую вобласць.

Паводле слоў французкіх газет, узброеныя сілы, якія накіроўваюцца ў Саарскую вобласць, будуць знаходзіцца ў ёй не больш 4-х месяцаў.

АБ КАЛГАСЕ І КАЛГАСНІКУ

Сёння мы друкуем агляд пісем раду калгаснікаў. Гэтыя пісьмы ўзнімаюць цэлую суму сур'ёзнейшых пытанняў, над якімі павінны задумацца кіраўнікі партыйных, совецкіх, калгасных арганізацый.

Мільёны працоўных аднаасобнікаў прышлі ў калгасы па закліку партыі. Уступаючы на новы шлях, яны раз і назаўсёды парвалі са сваімі дробнаўласніцкімі традыцыямі. Калгас для іх — гэта ўсё. Тут вызначаецца яго матэрыяльны добрабыт. Ад правільнай арганізацыі працы, ад умелага вядзення гаспадаркі залежыць заробак калгасніка. Тут задавальняюцца яго культурныя запатрабаванні і вымяраецца яго чалавечае достоінства. У асноўным праз калгас (наколькі ў вёсцы, як правіла, няма іншых грамадскіх устаноў) праяўляе ён сябе, як грамадзянін совецкай рэспублікі.

Калгас — арцель. Калгаснікі гаспадары сваёй арцелі. Партыя не раз падкрэслівала адрозненне калгасаў ад соўгасаў. Соўгас — дзяржаўная арганізацыя, дзе сума ўкладзеных капіталаў, як і сродкі вытворчасці, належаць дзяржаве. У соўгасе мы маем адзінаначалле, як на прадпрыемстве, маем дырэктара соўгаса, як на фабрыцы або заводзе. У арцелі — іншая справа. Тут укладзеныя капіталы, сродкі вытворчасці і іншая маемасць належыць не дзяржаве, а самім калгаснікам, уваходзячым у гэту арцель. Калгаснік—сутаспадар, атрымліваючы долю свайго даходу ад колькасці і якасці затрачанай ім працы. Праўленне падначалена агульнаму сходу калгаснікаў, яно працуе па ўказанню агульнага сходу і падсправаздачна яму. Зразумела, калгас не можа існаваць без дысцыпліны. Але гэта дысцыпліна будуецца на аснове разгорнутай дэмакратыі, якую забяспечвае справаздачнасць і грамадскі кантроль.

Сама сістэма пабудовы калгаса немінуча выклікае небывалую вытворчую актыўнасць мас. Гэта актыўнасць расла-б яшчэ хутчэй, калі-б яна не сустракала на сваім шляху шматлікія тормазы ў выглядзе грубага парушэння калгаснай дэмакратыі. Характэрнымі ў гэтых адносінах з'яўляюцца абуваючыя паводзіны старшыні ў калгасе «Чырвоны Окцябр». Тут старшыня Собалеў распараджаецца ў калгасе, як у сваёй вотчыне; на свайму асабістаму ўгледжанню растранжыроўвае ён калгаснае дабро.

Шматлікія сігналы з месц, друкуемыя «Звяздой», гавораць аб тым, што да гэтага часу мы маем шмала ў калгасах такіх «старшынь». Яны адыгрываюць у калгасах ролю, якая ў значна большай ступені падыходзіла-б былым упраўляючым у памешчыкаў. Няма сумнення, што падобныя паводзіны старшыні забіваюць вытворчую актыўнасць калгаснікаў, што яны не могуць самым пагубным чынам не адбіцца на гаспадарча-палітычным стане калгаса.

Партыйна-совецкія арганізацыі на мясцах вельмі мала звараюць увагі на пытанне аб разгортванні калгаснай дэмакратыі. Між тым гэта адно з асноўных пытанняў, забяспечваючых найхутчэйшы зыход барацьбы за большэвіцкія калгасы і заможнага калгасніка. Трэба каб кожны калгаснік ведаў свае правы, як правы і абавязкі праўлення. Трэба каб ніхто не меў права бескантрольна распараджацца калгасным дабром. Іменна адсутнасць кантролю і сістэматычнай справаздачнасці з'яўляецца спрыяючай глебай для ўсякага роду злоўжываванняў і растрат.

Трэба арганізаваць у калгасе сістэматычную справаздачнасць і кантроль. Трэба найстражэйшым чынам караць усіх тых, хто правіне самаўпраўствавать у калгасе.

Наступным сур'ёзнейшым пытаннем, якое высоўваюць перад намі пісьмы калгаснікаў, з'яўляецца пытанне аб **чулых адносінах да асобнага калгасніка, да яго патрэб.** Штодзенна ў калгасе ўзнікаюць тыя або іншыя патрэбы калгасніка, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння. Скажам, калгаснік захварэў, здарылася ней кае няшчасце, калецтва, пажар, загінула карова. Трэба з'ездзіць у больніцу ці проста на базар. Палітычны настрой у калгасе, працаздольнасць членаў калгаса — у агромаднай ступені залежаць ад таго, як чула вырашаюцца ў калгасе ўсе гэтыя жыццёвыя штодзенныя пытанні. Выпадак у калгасе «Камінтэрн», калі старшыня Хармянчук не даў каня ў больніцу параніўшаму сабе вока калгаснику, з'яўляецца яркім узорам зусім недапушчальных бюракратычных адносін да патрэб калгаснікаў. У даным выпадку дзеянні старшыні Хармянчука проста льюць ваду на млын класавага ворага.

Трэба чула адносіцца не толькі да ўдарніка і добрасумленнага калгасніка. Умелы, таварыскі, чулы падыход можа дапамагчы ў вядомых выпадках выправіцца калгаснику, які схільны к ленасці ці п'янству.

Які вывад павінны мы зрабіць для сябе з апублікаваных сёння пісем?

Калгас — гэта найвялікшая арганізацыя ў гісторыі чалавецтва. У нас ужо аб'яднаны ў калгасах дзесяткі мільёнаў людзей, якія становяцца сапраўднымі соцыялістычнымі тружанікамі, бо калгас — гэта найвялікшая зброя пабудовы соцыялізма. Пара перастаць глядзець на калгас і калгаснікаў толькі з пункту гледжання даных аб выкананні сяўбы, загатовак і іншых гаспадарча-палітычных кампаній. Пара зразумець, што **калгас — гэта арганізацыя жывых людзей** — грамадзян Совецкага Саюза, соцыялістычных труженікаў.

Увага жывому чалавеку — калгаснику! Іменна гэты важнейшы палітычны вывад павінны зрабіць усе з публікуемых сёння пісем калгаснікаў.

ХОД ВЫБАРАЎ У СОВЕТЫ ПА САЮЗУ

МАСКВА, 8 снежня. (БЕЛТА). Паводле даных Цэнтральнай выбарчай камісіі ЦВК Саюза ССР, на 7 снежня па Саюзу выбрана 42.894 сельскія советы — 68,3 проц. агульнага ліку. Яўка на выбарчыя сходы складала 83,2 проц. выбаршчыкаў (у мінулыя выбары — 70,4 проц.). Жанчын на сходы з'явілася 79 проц. агульнага ліку.

Усяго выбрана 889.702 дэпутаты сельскіх советаў. З іх жанчын 26,2 проц. (у мінулыя выбары — 21 проц.), калгаснікаў — 75,3 проц. (у мінулыя выбары — 33,7 проц.), членаў і кандыдатаў ВКП(б) — 18,8 (14,8 проц.), комсамольцаў — 11,3 проц.

Паводле даных на гэта-ж чысло, па Саюзу закончаны выбары ў 214 советах гарадоў і рабочых пасёлкаў. Яўка на выбарчыя сходы ў гэтыя советы складае 89,9 проц. ліку выбаршчыкаў (у мінулыя выбары 79,6 проц.); яўка жанчын складае 88,2 проц.

У советы гарадоў і рабочых пасёлкаў выбрана 21.499 дэпутатаў. З іх жанчын 30,9 проц. (у мінулыя выбары — 25,9 проц.), комуністаў 39,4 проц. (49,5 проц.), комсамольцаў 11,4 проц. (7 проц.), рабочых з вытворчасці 48,6 проц. (42 проц.).

Паўднёвая металургія выканала гадавое заданне па выпрацоўцы чыгуну

МАСКВА, 9 снежня. (БЕЛТА). Аб'яднанне «Сталь» і ЦК металургаў Поўдня рапартуюць ЦК ВКП(б)—тав. **Сталіну** і т. **Кагановічу**, Соўнаркому—т. **Молатаву** і Наркамцяжпрому —т. **Орджанікідзе** аб тым, што Паўднёвая металургія 5 снежня выканала павялічанае гадавое заданне па чыгуну ў размеры 5.624 тыс. тон. Да канца года рабочыя завода «Сталь» абязуюцца даць яшчэ 5 тыс. тон чыгуну звыш гэтага плана. Выплаўка чыгуну — вышэй мінулага года на 36 проц. Сабекошт адной тоны чыгуну знижан супроць 1933 года на 7 руб. 82 кап., або на 10 проц. Гэта дало дзяржаве звыш 40 млн. руб. эканомі.

Штомесячная выпрацоўка аднаго рабочага доменнага цэха дасягнула 32,6 тон чыгуну, супроць 24,4 тоны ў 1933 годзе. Прадукцыйнасць працы рабочых доменнага цэха павялічылася на 32,7 проц.

Побач з гэтым ішоў паралельны рост зарплаты рабочых і паляпшэнне іх культурна-бытавых умоў. Гэта акалічнасць адбілася на скарачэнні цякучасці рабочай сілы ў параўнанні з мінулым годам на 34 проц.

Значна павысілася тэхнічная культура рабочых, інжынераў і тэхнікаў доменных печей.

«Гэтых дасягненняў—гаворыцца ў рапарце—Паўднёвая металургія дабілася дзякуючы штодзённаму сталінскаму кіраўніцтву і выключнай дапамозе з боку тав. **Серго Орджанікідзе**, увазе і дапамозе ЦК КП(б)У ГУМП'а, Данецкага і Днепрапятроўскага абкомаў.

Ліст рабочых магілеўскай шоўкавай фабрыкі сакратару ЦК КП(б)Б тав. Н. Ф. Гікало

Дарагі таварыш Гікало!

Год таму назад, пасля таго, як наша фабрыка ўпершыню выканала датэрмінова свой гадавы прамфінплан, дэлегацыя лепшых людзей нашай фабрыкі гутарыла з вамі аб выніках нашай работы, аб нашых далейшых задачах. У гэтай гутарцы вы, таварыш Гікало, сказалі, што калектыў фабрыкі, лепшыя яе людзі павінны справай сваёю ўзнагу пастаўіць задачу — даць самую лепшую ў Саюзе якасць прадукцыі, і тут-жа вы ўказалі шлях.

— Вы павінны рэзка павысіць культуру сваёй работы».

— Як у вас, бруднавата ў цэху? — спытаўся вы тав. Бажанава — аднаго з старэйшых нашых прадзільшчыкаў.

— Бруднавата, — засаромеўся Бажанаў.

— Вось трэба, каб чыста было ля варштата, пад варштатам, у цэху, у корпусе. Культуру ў цэх, культурныя адносіны да інструментарыя, да варштата, да таварыша па рабоце і, самае галоўнае — трэба больш біцца за культуру ў быту. Вось план выконваць вы як быццам напучыліся. Больш увагі трэба аддаваць жывым людзям, жывому чалавеку. Трэба змагацца за чыстую кватэру, добры абед у добрай сталоўцы, нармальнае перасоўванне рабочых.

Гэтыя ўказанні сталі праграмай для работы ўсёй фабрыкі.

Дэлегаты, былыя ў вас, сталі найпершымі застрольшчыкамі ў барацьбе за культурную работу, у барацьбе за правядзенне вашых указанняў. «Мне сам Гікало гаварыў» — пачынаў сход прадзільшчык, обер-майстар Бажанаў, і ў результаце гэтага, у результаце мабілізацыі ўсяго калектыва фабрыкі мы 27 лістапада скончылі промфінплан у цяжкасным выражэнні і 7 снежня па ўсіх паказальніках.

Сёння пяцітысячны калектыў фабрыкі б'ецца за тое, каб выканаць данья ЦК партыі і вам, таварыш Гікало, абяцанні — даць у падарунак з'езду працуючы на 5½ мільёнаў рублёў звыш плана.

Не пазнаць цяпер нашы фабрычныя плянтоўкі. Горы смецця, запушчанасць, змяшілі клумбы, кветкі, фантаны, як на плянтоўцы ПЭЦ. Непраходную грязь змянілі асфальтаваныя дарожкі, шашы. Былушы сапым апошнім прадзільны корпус, на чале з яго лепшымі ўдарнікамі і обер-майстрам Бажанавым, заняў першае месца, атрымаў пераходны чырвоны сцяг фабрыкі, стаў вядучым цэхам і паказвае прыклады таго, як трэба працаваць па-новаму.

— Клопаты аб рабочых, аб жыллём рабочым чалавеку, штодзённыя аб ім клопаты, умелае яму дапамагчы — вось што адрозніваё большэвіка, — гаварылі вы.

І мы дакладваем: 200 рабочых кватэр намі адрамантавана. 3½ сотням рабочых выдан матэрыял для рамонту, адрамантован інтэрнат на 300 чалавек, рабочыя фабрыкі атрымалі дровы. Сотні рабочых уставілі шыбы ў вокны сваіх кватэр ды дамамозе фабрыкі. Тысячы рабочых жывуць больш чым па 100 цэлых бульбы са сваіх агародаў. Гэтымі днямі мы атрымаем адзін з двух і атрымліваем другі аўтобус для перавозкі рабочых.

Адно з пытанняў, у якім вы нам аказалі істотную дапамогу,— гэта пытанне аб хлабе. Але зараз гэта пытанне вырашана для ўсяго Совецкага Саюза, вырашана моцна і канчаткова. З вялікім заданаленнем сустрэлі рабочыя рашэнне Цэнтральнага Камітэта нашай партыі аб адменеканартачнай сістэмы. Мы расцэньваем гэта рашэнне, як неабвержны доказ буйнейшых поспехаў нашага соцыялістычнага будаўніцтва, нашай партыі, нашага геніяльнага правадыра таварыша **Сталіна.**

Выконваючы вашы ўказанні, таварыш Гікало, мы лепшых ударнікаў фабрыкі разам з удзельніцай нашай леташняй дэлегацыі ў вас тав. Ракіцкай пасялі на палепшэнне работы сталоўкі. Усё гэта рэзка павысіла добрабыт рабочых, ПР фабрыкі і, дзякуючы гэтаму, вам не толькі ўдалося выканаць датэрмінова промфінплан, але самае галоўнае — мы здолелі даць небывалую яшчэ ў краіне якасць штучнага шоўку, даючы ў апошні час 95 проц. першых двух гатункаў замест 83 проц., устаноўленых саюзным урадам. У нас яшчэ безліч непаладак, шмат недахопаў, але мы іх пад кіраўніцтвам ЦК, пад вашым кіраўніцтвам знішчым, тав. Гікало. Мы гэтыя недахопы знішчым таму, што мы іх яснa бачым.

Зараз мы працуем над праблемай афарбоўвання нашага шоўку. Мы не вырашым, таварыш Гікало, не гледзячы на ўсе труднасці, што перад вамі стаяць, і тады наш шоўк будзе сапраўды лепшым шоўкам у свеце.

Дарагі таварыш Гікало! У гэтыя дні, калі ўся краіна перажывае жывы пострываны боль, нанесены куляй, пушчанай подлай рукой прадстаўніка памірачотага свету, у гэтыя дні, калі хвалі агнівога гневу душаць нашы грудзі, у гэтыя дні мы яшчэ больш, яшчэ лепей разумеем усю веліч, усю магутнасць, усю адданасць справе рабочага класа нашай партыі, выпеставаўшай такіх людзей, як Сергей Кіраў. І мы, пяць тысяч пролетарыяў, на справе паказаўшы ўменне змагацца за справу партыі, за справу Леніна-Сталіна, за справу перамогі соцыялізма ў нашай краіне, за справу соцыялізма ва ўсім свеце, гаворым, мы гаворым пролетарыям Беларусі, пролетарыям Саюза, пролетарыям усяго свету: «Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся вакол комуністычнай партыі, пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся вакол кіраўніка і правадыра нашага роднага Сталіна!» Мы гаворым: «Таварышы, у свеце ёсць адна партыя, пад сцягамі якой можна змагацца і варта памерці, — гэта сцяг комуністычнай партыі, гэта сцяг Леніна - Сталіна, гэта сцяг, пад якім жыў, змагаўся і загінуў Сергей Кіраў».

У гэтыя незабыўныя дні, калі ўся краіна згуртавалася вакол сваёй партыі, мы клянемся: якасцю сваёй работы, згуртаваўшыся вакол нашай партыі, адкажам мы на подлую кулю з-за вугла. Мы, пяць тысяч пролетарыяў фабрыкі, створанай ленінска - сталінскай нацыянальнай палітыкай, клянемся па-большэвіцку змагацца за справу партыі, палепшаючы кожны дзень нашу працу. Мы пільна сочым за ўчынкамі ўсіх нашых ворагаў унутры і звонку краіны. Мы копім велізарнейшы гнеў, які клокоча ў нашых грудзях. Мы гаворым: найпрыгажэйшую ў свеце шаўковую тканіну — для нашых прыяцеляў, будаўніцтва новага небывалага прыгожага жыцця — для рабочага класа і мільёны жалезных куль — для нашых ворагаў па-першаму клічу нашай партыі.

Няхай жыве родная і адзіная партыя рабочага класа — ВКП(б), не ленінскі Цэнтральны Камітэт!

Няхай жыве родны наш таварыш Сталін!

Няхай жыве КП(б)Б — правадзік ленінска - сталінскай нацыянальнай палітыкі на мяжы з капіталістычным Захадам, згуртоўваючы працоўных КП(б)Б для рашучых баёў за справу соцыялізма!

Няхай жыве кіраўнік большэвіцкай Беларусі таварыш Гікало!

ВЫСТУПЛЕННЕ ТАВАРЫША ЛІТВІНАВА НА ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА ЛІГІ НАЦЫЙ

ЖЭНЕВА, 8 снежня. (БЕЛТА). Пасля Алаізі таварыш Літвінаў выступіў на пасяджэнні совета Лігі нацый з наступнай прамовай:

«Узбуджанае перад намі югаслаўскім урадам пытанне прадстаўляецца ў некалькіх аспектах. Па-першае, у якасці скаргі на дзеянні венгерскіх улад у парадку артыкула 11 статута Лігі. Совет абавязан разабрацца ў фактах, прадстаўленых адным і другім бокам, абмеркаваць іх абгрунтаванасць і вынесці адпаведнае рашэнне. Я ў сучасны момант не магу яшчэ выказацца па поваду гэтых фактаў, але мне здаецца, што калі-б гэтых фактаў і не было, або калі праверка іх аказалася немагчымай, то і тады пацярпеўшыя краіны, як Югаславія, так і Францыя, былі-б у праве, як гэта мае месца ў прыватных судах, хоць гэта і не прадугледжана статутам Лігі, унесці скаргу на «невядомага» і дабівацца ад совета задавалення ў якасці асуджэння гэтага «невядомага». Бо не падлягае сумненню, што марсельскія падпалі былі результатам не толькі дзеянняў іх непасрэдных удзельнікаў, але і папушчальнасці, а можа быць і дапамогі, скажам, невядомых улад невядомай краіны.

Пытанне, аднак, мае і другі аспект, а іменна — у якасці агульнай міжнароднай праблемы. З гэтага пункту гледжання мы можам толькі быць удзячны югаслаўскаму ўраду за тое, што ён звярнуў увагу совета на тэрарызм, як на адну з агіднейшых і небяспечнейшых з'яў у міжнародным жыцці, і я хачу выказаць свае меркаванні імен на аб гэтым баку справы.

Індывідуальны тэрарызм у якасці зброі палітычнай барацьбы вядом у краіне, якую я маю гонар прадстаўляць тут, больш, чым у якой-бы там ні было другой. Вы, напэўна ўсе помніце ці ведаеце, што ў даваенны час некаторыя рэвалюцыйныя партыі ў Расіі галоўную сваю дзейнасць канцентравалі на індывідуальным тэроры супроць прадстаўнікоў царскага рэжыму. Але і тады ў Расіі аказалася другая рэвалюцыйная партыя, а радоў якой выйшаў сучасны совецкі ўрад, і я сам, якая вяла ўпартую ідэалагічную барацьбу з тэрарызмам. Яна ўказвала на поўную бяссэнсасць і шкоднасць гэтага спосабу барацьбы. Такую-ж пазіцыю ў адносінах тэрора займалі і цяпер займаюць усе тыя рэвалюцыйныя партыі ў другіх краінах, якія падобна нашай партыі кіруюцца вучэннем Маркса.

Справядлівасць патрабуе адзначыць, што тагочасныя тэрарысты, асабіста чэсныя, натхняліся свабодалюбствам і праграсіўнымі ідэямі. Апрача таго, яны сваю тэрарыстычную праграму выконвалі выключна ў сваёй уласнай краіне — у Расіі. Гісторыя рускіх тэрарыстаў, за выключэннем аднаго факта, не ведае выпадкаў замаху на прадстаўнікоў царскай улады за граніцай, хоць і тады было не мала рускіх эмігрантаў, у тым ліку і тэрарыстаў. Яны лічылі перанясенне тэрарыстычнай дзейнасці за межы ўласнай краіны трусасцю і недапушчальным злоўжываннем правам прытулку.

На здымку: совецкая дэлегацыя на асамблеі Лігі нацый у Жэневе: тт. М. Літвінаў, В. Пацёмкін і сакратар дэлегацыі З. Гершэльман

Калі мы, тым не менш, тагочасныя тэрарыстычныя акты, незалежна ад іх матываў, сурова асуджалі за іх бяссэнсасць, непатрэбнасць і нават шкоднасць, дказаная ўсёй гісторыяй рэвалюцыйнага руху ў маёй краіне, то мы не можам не адносіцца з абурэннем і агідаю к таму тэрарызму, які стаў практыкавацца ў апошні час. Паміма таго, што гэты спецыфічны тэрарызм, як і ўсякі іншы тэрарызм бяссэнсны і ніколі не дасягае сваёй мэты, ён к таму-ж у большасці выпадкаў, калі не ва ўсіх вядомых нам выпадках, натхняецца самымі рэакцыйнымі ідэямі, выходзіць часта з самых рэакцыйных колаў, якія імкнуцца ўваскрасіць аджыўшыя і асуджаныя гісторыяй антынародныя рэжымы і навярнуць гісторыю чалавецтва на стагоддзі назад. Нярэдка ён звязан ідэалагічна і нават практычна з партыямі, якія лічаць за асаблівую сваю заслугу барацьбу з марксізмам, з тым самым марксізмам, які, як мною было толькі што сказана, заўсёды з'яўляўся і з'яўляецца адмаўленнем і праціўнікам тэрарызма.

Асаблівасцю гэтага роду навейшага тэрарызма з'яўляецца тое, што ён амаль заўсёды падрыхтоўваецца і ажыццяўляецца на чужой тэрыторыі, фінансуецца з замежных крыніц і, свядома ці не свядома, становіцца зброяй замежнай палітыкі. Гэта асаблівасць і заслугоўвае ўвагі совета, бо мы маем тут справу са з'явай, якая яўна награжае міру. Ні адна дзяржава не можа мірыцца з тым, каб на тэрыторыі другіх дзяржаў дапускалася падрыхтоўка і арганізацыя замахаў на жыццё не прадстаўнікоў, у асаблівасці калі ёсць падставы падазраваць не толькі папушчальнасць, але спачуванне і пасобніцтва з боку цэнтральных, ці хоць-бы мясцовых, улад гэтых дзяржаў. На грунце такіх актаў ствараюцца непаразуменні, інцыдэнты, канфлікты паміж дзяржавамі, якія пагражаюць часам пераходам за ўзброеныя сутычкі. Мы ўсе ведаем такі канфлікт у апошні час, калі прабавалася выключная цярпімасць і спагадлівасць з боку пацярпеўшай дзяржавы, каб былі пазбегнуты разрыў адносін і больш грозныя результаты. Дапушчэнне адкрытай дзейнасці і арганізацыі тэрарыстаў, усхваленне іх і заступніцтва за іх у прэсе, цкаванне прадпалагаемых альбо замахаў, апраўданне тэрарыстычных актаў судом або спагадлівыя да іх адносіны — усё гэта стварае тое падпрымліваючае асяроддзе, без якога тэрарызм не можа існаваць.

Мая краіна ведае гэта па горкаму вопыту, бо яна сама страціла двух сваіх дыпламатычных прадстаўнікоў за граніцай, загінуўшых ахвярамі тэрарызма, узнікшага на вышэйадзначанай глебе. Мне застаецца толькі дадаць, што тэрарыстычныя акты за апошні час часамі прадпрымаюцца загадзя, з мэтай стварэння поваду для парушэння міру паміж двума дзяржавамі. Марсельскія стрэлы з асаблівай яркасцю раскрылі перад сазнаннем усяго свету, якую велізарную небяспеку для захавання міжнародных адносін і ўсеагульнага міру прадстаўляе сабой тэрарызм пасля ваеннага часу, і Ліга нацый павінна звярнуць увагу на гэту з'яву і напрабаваць выпрацаваць меры практычнай барацьбы з ім.

Паставіўшы сабе гэту практычную задачу, мы не павінны, аднак, зьбяжаць і абмяжоўваць яе выпадкамі тэрарызма ў тэхнічным значэнні гэтага слова.

Паважаны міністр замежных спраў Чэхаславакіі правільна ўказваў тут на другія, бліжэйшія да тэрарызма з'явы, якія могуць прывесці да таго-ж сумнага рэзультата ў міжнародным жыцці, як і сам тэрарызм. Такавы, напрыклад, арганізацыя эміграцкіх узброеных банд для пранікнення на чужую тэрыторыю, дапушчэнне ваенных ці арганізаваных па ваеннаму ўзору арганізацый для барацьбы з другімі дзяржавамі. Гэта не толькі блізкія, але і цесна звязаныя паміж сабой з'явы. З радоў падобных арганізацый і банд выходзяць тэрарысты, і сам тэрарызм з'яўляецца адной з функцый гэтых арганізацый.

Краіна, якая цярпіма адносіцца да падобных арганізацый у сябе, сама можа лёгка стаць ахвярай такіх-жа арганізацый у чужых краінах. Неабходнасць у гэтым пытанні агульных міжнародных акцый вусім відавочна. Тут таварыші аб злоўжыванні правам прытулку, але гэтым злоўжываюць часьмі не толькі самі тэрарысты, але і тыя ўлады, якія прыкрываюцца гэтай тэорыяй для апраўдання тэрарыстычных дзеянняў. Мы ведаем, што тыя самыя дзяржавы, якія даюць самую шырокую гасцінасць эміграцтам паўнай палітычнай афарбоўкі, забываюць аб праве прытулку, калі яно просяць эміграванты другой палітычнай афарбоўкі.

Калі результатам абмеркавання пытання, якое стаіць перад намі, з'явіцца выпрацоўка агульных мер барацьбы з указанымі мною з'явамі, прадстаўляючымі адну з пагроз міру, мы будзем гэтым абавязаны ініцыятыве югаслаўскага ўрада.

Я зусім не намеран пераўвялічваць значэнне данага пытання і далёк ад думкі аб тым, што тэрарызм сам па сабе з'яўляецца прычынай войнаў. Калі-б мір паміж народамі базаваўся на салідным глебе і калі-б не было другіх больш глыбокіх прычын для парушэння гэтага міру то, можа быць не варта было-б міжнародная арганізацыі займацца пытаннем аб тэрарызме, дый сам тэрарызм, можа быць, тады на існаваў-бы, па крайняй меры, у яго сучасных размерах. Але іменна таму, што мір нетрывалы, нават не асаблівага значнага поваду могуць паскорыць парушэнне яго. І Ліга нацый не выканала-б доўг вартаўніка міру, калі-б яна пакінула без увагі знішчэнне ці хоць-бы змяншэнне магчымасці гэтых поваду. Я спадзяюся, што совет Лігі выканае свой доўг».

РАСКРЫЦЦЕ ШПІЁНСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ У АУСТРЫІ

ВЕНА, 9 снежня. (БЕЛТА). Венгерскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе аб раскрыцці ў Вене нацыянал - соцыялістскай шпіёнскай арганізацыі. Аўстрыйскімі ўладамі праведзены шматлікія арышты.

ГАЛАДОЎКА 1040 ЗНЯВОЛЕНЫХ У ПОЛЬСКАЙ ТУРМЕ

ВАРШАВА, 8 снежня. (БЕЛТА). Як паведамляе «Роботнік», пачынаючы з 3-га снежня, праводзіцца галадоўка 1040 зняволеных у турме ў Тарнове. Аб лёсе зняволеных друк нічога не паведамляе. Свідаўні зняволеных в сем'ямі забаронены.

ЧАГО НЕ ЗРАЗУМЕЛІ БРАГІНСКІ І ЛОЕЎСКІ РАЙКОМЫ?

„НЕКАТОРЫЯ РАБОТНІКІ НЕ ЗРАЗУМЕЛІ СУТНАСЦІ ПЕРАБУДОВЫ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ, УСТАНОЎЛЕНАЙ XVII З'ЕЗДАМ, НЕ ЗРАЗУМЕЛІ, ШТО ЦЭНТРАМ ГЭТАЙ ПЕРАБУДОВЫ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ЧЛЕН ПАРТЫІ, ЯГО ІДЭЙНАЕ ЎЗБРАЕННЕ, ЯГО ПАЛІТЫЧНЫ РОСТ І АКТЫЎНАСЦЬ". *(КАГАНОВІЧ)*

Друкуемыя намі сёння выступленні з Лоева і Брагіна розныя па свайму зместу, але абедзве гавораць адным і тым-жа. Яны сведчаць аб аб тым, што, не гледзячы на неаднаразовыя ўказанні партыі, на ўказанні тав. Кагановіча, некаторыя не разумеюць сутнасці перабудовы партработы. Комуніст тут не толькі не стаіць у ЦЭНТРЫ ўвагі партыйных органаў, ён не карыстаецца той неабходнай увагай, якой патрабуе партыя. Перад намі два комуністы — 25-тысячнік Мулеў і б. чырвонаармеец Тарасенка. Характэрна, што і той і другі прышлі да свайго грэхападзення НЕ АДРАЗУ. І той і другі, стаўшы на чале калгаса, пачалі нядрэнна работу па яго ўмацаванню. Але ў самым пачатку кожны зрабіў памылку, якая потым спрыяла да сумных рэзультатаў.

Тарасенка не заўважыў, як класава-варожыя элементы, якія прыталіліся ў калгасе, акружылі яго сваім «актывам». Гэты «актыў» пацягнуў яго ў абдымкі кулака. Спачатку ён зайшоў к кулакам на пірушку, «каб — паводле яго слоў — выведаць настрой класавага ворага», а потым за чаркай гарэлкі, як відаць, кулакі паказаліся яму зусім не такімі страшнымі і не шкоднымі людзьмі. Быць можа ён збіраўся іх нават «перавыхаваць», але на справе яны «перавыхавалі» яго самога.

Мулеў, трапіўшы ў калгас, дапусціў другую памылку. Убачыўшы, што калгас засмечан класава-варожымі элементамі, ён замест таго, каб згуртаваць вакол сябе здаровую частку калгаса, стварыць актыў і пры дапамозе мас выкрыць і ачысціць калгас ад чужакоў, замкнуўся ў сябе і стаў на шлях адміністравання. Як парторг калгаса, ён не вёў ніякай масава-растлумачальнай работы. Пакрыванне і загад сталі яго метадам работы. У рэзультаце замест таго, каб ізаляваць варожыя элементы, ён сам апынуўся ізаляваным ад мас. Ён не мог даглядзець адзін за ўсімі ўчасткамі работы. Адсюль бязгаспадарчасць і шкодніцкая дзейнасць на радзе участкаў.

Камандаванне перарастае ў зажым самакрытыкі. Адсутнасць самакрытыкі, бескантрольнасць ствараюць спрыяючую глебу для ўсякага роду злоўжыванняў. У далейшым Мулеў парушае партыйную этыку, за кошт калгаса купляе веласіпед, адкормлівае сваіх кабаноў і т. д. Мулеў устае на шлях перараджання.

Якава-ж была роля брагінскага і лоеўскага райкомаў? Ці дапамаглі яны таму і другому комуністам выправіць іх памылкі ў самым пачатку? У адносінах да Тарасенка «кіруючая» роля лоеўскага райкома звялася толькі да двух момантаў: адзін раз яго паслалі старшынёю, другі раз яго знялі. Што датычыць Мулева, то брагінскі райком да гэтага часу не лічыць, што гэтым комуністам трэба заняцца. Мулеў выконвае загатоўкі, у Мулева ўвогуле нядрэнна ідуць справы, і таму райком глядзіць скрозь пальцы на парушэнне Мулевым калгаснай дэмакратыі, на яго асабістыя непрыстойныя ўчынкі.

Паўстае пытанне, што-ж робяць інструктары райкомаў у калгасах, калі комуніст прадастаўлен па-ранейшаму самому сабе, калі яго ніхто не вывучае, калі яго няма кому своечасова падправіць і падтрымаць у барацьбе з чужым элементам.

Справа Мулева і Тарасенка гаворыць аб неканкрэтнасці кіраўніцтва, аб няведанні людзей, аб тым, што, як сказаў тав. Каганові ч «некаторыя работнікі не зразумелі СУТНАСЦІ перабудовы партарганізацыі, устаноўленай XVII з'ездам, не зразумелі, ШТО ЦЭНТРАМ ГЭТАЙ ПЕРАБУДОВЫ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ЧЛЕН ПАРТЫІ, ЯГО ІДЭЙНАЕ ЎЗБРАЕННЕ, ЯГО ПАЛІТЫЧНЫ РОСТ І АКТЫЎНАСЦЬ». Асабліва ўказана і надзенна гэта задача ў вёсцы, дзе большасць комуністаў — малодыя члены партыі або кандыдаты, дзе нед імі яшчэ вісяць старыя дробнаўласніцкія перажыткі.

Рашуча выправіць памылкі, перабудавацца ў адпаведнасці з указаннямі тав. Кагановіча — вось што патрабуецца ад брагінскага і лоеўскага РК. Іх-жа памылкі павінны быць улічаны іншымі райкомамі.

Аб памылках комуніста Мулева і канцэлярска-бюракратычных метадах кіраўніцтва Брагінскага райкома

БРАГІН. (Ад спецыяльнага карыспандэнта «Звязды»).

Група калгаснікаў і настаўнікаў з калгаса «Чырвоны Окцябр», Мікуліцкага сельсовета, Брагінскага раёна, піша ў рэдакцыю аб тым, што «у выніку няправільнага кіраўніцтва старшыні калгаса тав. Мулёва Васіля калгас мае цэлы рад недахопаў». З лютага 1934 г. кіраўніком калгаса стаў рабочы, член партыі з 1931 года, дваццаціпяцітысячн. тав. Мулеў Васіль. Не сустракаўшы належнага патрымання ў сваёй работе з боку нават актыва, ён рашыў моцна ўзяць у свае рукі кіраўніцтва калгасам. Трэба аддаць справядлівасць і адзначыць, што за гэты год калгас эканамічна вырас. Арганізавана была праведзена ўборачная кампанія, не закончылі за 10-15 дзён. У гэтым годзе знялі з гектара зернавых 12,3 цэнтнера і бульбы 104 цэнтн. Калгаснікі ўжо атрымалі авансам на працадзень па 6,5 кгр. бульбы і 1,5 кгр. зернавых.

За гэты год таксама вырасла і пагалоўе жывёлы. Тав. Мулеў, як і належыць партыйцу, галоўнейшай задачай паставіў выкананне абавязацельстваў перад дзяржавай. Калгас набыў у гэтым годзе 1½-тонную грузавую машыну і адначасова аграмадны размах набыло тут будаўніцтва.

Тав. Мулеў не зразумеў значэння палітвыхаваўчай работы, якая зусім не вялася. Гэта скарысталі класавыя ворагі, пралезшыя ў калгас, і пачалі ўстаўляць палкі ў калёсы. У пачатку года на свінаферме загінула 76 штук маладняка, на МТФ — 30 штук жывёлы. Ветэрынарным фельчарам працаваў кулак Прочанка Васіль, які меў сувязь з бандытамі Германенка і Кацуба.

Кулацкую групу ў калгасе ўзначальвалі Гончар Кузьма, Маров Рыгор, Здаравец Сцяпан, Гончар былы царскі афіцэр. Працуючы ў калгасе, агітаваў супроць усіх мерапрыемстваў партыі, не падпарадкаваўся дысцыпліне, здзекаваўся пад насценнай газетай, заўсёды зрываў ударныя работы, агітаваў супроць продажу хлеба дзяржаве. Кулак Маров Рыгор уцёк з калгаса. Здаравец Сцяпан, былы афіцэр, рэдка выходзіў на работу, агітаваў супроць калгаснага будаўніцтва. Такары главары кулацкай групоўкі.

Старшыня калгаса Мулеў, ёпжа і гарторг, працаваў адзін. Ахапіць усё ён не быў здолен, бо калгас вялікі, участкі яго раскіданы. На ўсе чатыры нагі кульгала палітвыхаваўчая работа. Партгрупа не ўзначаліла актыўнасць перадавых калгаснікаў. Працуючы ў абстаноўцы моцнага ўплыву кулакоў, тав. Мулеў не мог адрозніць здаровую і нездаровую крытыку, не мог процідаставіць ім партыйны ўплыў, палітвыхаваўчую работу. Натуральна нарадзілася моцная боязнь самакрытыкі.

Наступная памылка тав. Мулева заключаецца ў тым, што ён пачаў сваю работу ў калгасе з асабістага ўзбагачэння. За прэмію ад прадаванага калгасам хлеба ён купіў сабе веласіпед. Адразу-ж як ён прыбыў у калгас, ён пачаў карміць 4 кабаны, не маючы для іх свайго корму. Жонка яго брала астаткі ў сталовай. Незаконна ён выменяў карову. Гэтыя яго дзеянні далі повад да развязвання кулацкай работы ў калгасе.

Вось якая сітуацыя стварылася ў калгасе «Чырвоны Окцябр», Мікуліцкага сельсовета, Брагінскага раёна. Аб усім гэтым ведаў РК КП(б)Б і яго сакратар тав. Кожар. Але ясна, што райком яўна непаацаніў падзей, якія адбываюцца ў калгасе. Больш таго, райком праявіў гнілы лібералізм у справе аздараўлення калгаса. **Райком зараз казырае** дасягненнямі «Чырвонага Окцябра», прылівам, набытым грузавіком і т. д. Але ці разбіраў райком па сутнасці становішча ў калгасе? Не, гэтага не было. Намеснік сакратара РК тав. **Штэйн** паказвае акуратна складзеныя ў папцы выразкі з «Звязды» і адказы ў рэдакцыю, і толькі. А дзеласлога вырашэння пытання не было. Інструктар РК па Мікуліцкаму сельсовету тав. Музычкіна ні разу не дакладвала аб становішчы калгаса. Работнікі РК бачылі, што ў калгасе ёсць бязгаспадарчасць, але ні разу не задалі сабе пытання: чаму гэта так? Віна райкома і ў тым, што ён не аказаў дапамогі і не ўказаў правільнага шляху тав. Мулеву.

У пратаколе РК ад 25 кастрычніка, на які спасылаецца сакратар РК Кожар, ёсць агульная канстатацыя фактаў і звычайная балбатня. Хіба можна лічыць канкрэтнай дапамогай тое, што ў пастанове запісана: «Прапанаваць Мулеву і партгрупе ў цэлым **арганізаваць** сістэматычную выхаваўчую работу сярод калгаснікаў і калгасніц», або другія агульныя пункты ў тым-жа духу. Аздараўіць калгас тут рашылі фармальна. Вычысцілі трох кулакоў, і ўсё. А РВК і райземаддзел тав. Шэўчанка проста аказаліся нездольнымі ліквідаваць недахопы ў калгасе. **Уся работа** ў калгасе «Чырвоны Окцябр» была ўзвалена на плечы аднаго недастаткова падкаванага Мулева, які і заблытаўся.

І такія факты не адзіныя па Брагінскаму раёну.

Г—я.

ЦІ ВІНАВАТ У СВАІМ „ГРЭХАПАДЗЕННІ" АДЗІН ТАРАСЕНКА?

ЛОЕЎ. (Ад спецыяльнага кар. «Звязды»).

За 30 кілометраў ад раённага цэнтра знаходзіцца вёска Бушаціч, Лінякоўскага сельсовета. З дагняга часу тут панавала кулацкае засілле. Класавая барацьба ў розныя перыяды прымала тут самы жорсткі характар. Мясцовыя жыхары яшчэ памятаюць выпадак, калі ўпоўнаважанага па харчразвёрстцы разрэзанымі кулакі ў белы дзень павесілі сярод вёскі.

У выключна цяжкіх умовах у гэтай вёсцы ў 1931 г. быў арганізаван калгас імя **Варашылава.** Але група былых балахоўцаў і кулакоў, пралезшая ў калгас, захваціла ў свае рукі ўсе ўчасткі кіраўніцтва. Праўленне складалася з сваякоў: Вырва Марцін—член правлення, Вырва Пілип—мылнар, Вырва Кастусь—брыгадзір і Вырва Сямён—кладаўшчык. Гэта зграя ўсю работу накіроўвала па-свойму—утойвала хлеб ад дзяржавы, раскрадала калгасную маемасць, карацей кажучы, рабіла ўсё, каб хутчэй развяліць калгас.

У жніўні 1933 года старшынёй калгаса быў выбран кандыдат партыі тав. **Тарасенка Андрэй.** З першых-жа дзён кулацкія агенты Куляш Рыгор і Гусак Лявон пачалі напружаць новаму старшыні.

— Калі хочаш жыць у нас,— заявілі яны,—будзь з намі ў хеўры, а то ўбярэм, не такіх убралі.

Але тав. Тарасенка, не гледзячы ні на якія пагрозы, рашыў адпавець даведзеную да развалу гаспадарку. З вялікім запалам ён узяўся за работу. За год пры ім у калгасе пабудаваны 2 канюшні, кароўнік, пажарны хлеў, клуб. Набыты конныя граблі і касілка, адрамантаваны і пачалі працаваць кузня і вятрак. Буйная рагатая жывёла павялічылася з 72 да 97 галоў. Колькасць коней—з 73 да 76. Адначасова калгас умацоўваўся і арганізацыйна. З калгаса былі выкінуты кулакі Такарэнка Сідар, Кулеш Хіма, Кулеш Іван, Трубіла Макар.

Кулацкае ахвосце, бачачы, што ў адкрытым ба Тарасенку ўзяць нельга, пачало дзейнічаць другімі метадамі.

У сельпо працаваў прадаўшчыком Лагута Фёдар. Сын кулака, брат забойцы, заўзяты злодзей, прайдоха Лагута ўхітрыўся займаць адначасова тры пасады: прадаўшчыка, вартаўніка і пісьманосца За растрату каапераціўных грошай ён два разы быў пад судом. І вось гэты Лагута стаў сустракацца з Тарасенка. Пачалося з выпівкі. Хутка Лагута стаў заваёўваць давер'е Тарасенкі і пачаў яго спойваць. Папойкі сталі сістэмай.

З гэтага часу і пачалося грэхападзенне кандыдата партыі Тарасенкі. Кулак Лагута стаў яго правай рукой. Дайшло да таго, што за бутылку гарэлкі кулакі і падкулачнікі дабіваліся ў Тарасенкі, чаго толькі хацелі. Падкулачнікам Куляшам Тарасенка адпускаў за гарэлку калгасныя прадукты. Кулакам з суседняй вёскі Баршчоўка за выкананне плана лесазвазкі ён адпусціў 200 кгр бульбы і 40 кгр. гароху. З кожным днём Тарасенка каціўся ўсё ўніз, дайшоў да таго, што ён стаў раскрадаць памольны збор, алей, прапіваць калгасныя грошы.

Аб усім гэтым перадавыя калгаснікі пачалі сігналізаваць у раённую газету, «Калгаснік». Аднак раённыя арганізацыі не прымалі ніякіх мер да аздараўлення калгаса. Толькі пасля з'яўлення заметкі ў «Звяздзе» на месца выехала спецыяльная камісія, якая ўстанавіла сапраўднае становішча ў калгасе. Прэзідыум РВК 16-га кастрычніка зняў Тарасенку з пасады старшыні.

Справа Тарасенкі даволі павучальная. Перад чытачом мімаволі паўстае пытанне: ці вінават у сваім падзенні адзін Тарасенка. Падзенне-ж адбылося не адразу. Спачатку Тарасенка змагаўся. Але, будучы маладым комуністам, недастаткова ўстойлівым, ён аказаўся апрацаваным класавым ворагам.

Вёска Бушаціч самая далёкая. Будучы ў мінулым бандыцкім гняздом, яна патрабавала да сябе выключнай увагі. Аднак, раённыя работнікі тут былі рэдкімі гасцямі дый то наскокамі — на гадзіну-дзве. Фактычна Тарасенка аказаўся тут адзін. Яму ніхто не дапамагаў. Ён стаў шукаць сабе актыў. Гэта адразу ўлічылі ворагі і пралезлі ў «актывісты», уцерліся ў давер'е, акружылі ўвагай.

Ставіцца пытанне: дзе-ж быў райком партыі, дзе была штодзённая дапамога і кіраўніцтва маладым комуністам—старшыням калгаса?

АСАБІСТЫЯ ІНТАРЭСЫ КАЛГАСНІКАЎ СПАЛУЧАЦЬ З ГРАМАДСКІМІ

(АГЛЯД ПІСЕМ КАЛГАСНІКАЎ)

АД РЭДАКЦЫІ:

Змяшчаючы агляд пісем аб фактах адміністравання ў калгасах і нячулых адносін кіраўнікоў калгасаў да патраб асобных калгаснікаў, «Звязда» чакае, што Менскі гарком, Мазырскі, Чавускі і Слуцкі РК паставяць абмеркаванне такіх пытанняў на палітычную вышыню і мабілізуюць увагу комуністаў і ўсяго калгаснага актыва да задач бязлітаснай барацьбы з адміністраваннем і нячулымі адносінамі па патрэбах асобных калгаснікаў.

Сельскагаспадарчая арцель, якая развіваецца на аснове калектыўнай грамадскай уласнасці і дае магчымасць шырока скарыстоўваць перавагі буйнай соцыялістычнай вытворчасці, з'яўляецца ў сучасных умовах адзіна правільнай формай калгаснага руху. У сельскагаспадарчай арцелі лепш за ўсё спалучаюцца асабістыя бытавыя інтарэсы калгаснікаў з грамадскімі. У арцельнай форме калгаса знойдзена лепшая форма разгортвання шырокай ініцыятывы калгасных мас.

Аднак, гэтыя прынцыпы арганізацыі сельскагаспадарчай арцелі часамі груба скажаюцца на мясцах не ў меру заўзятымі мясцовымі работнікамі. Аб гэтым сведчыць рад пісем калгаснікаў, атрыманых у апошні час рэдакцыяй.

Перад намі пісьмо групы калгаснікаў з сельска-гаспадарчай арцелі «Чырвоны Окцябр», Чавускага раёна. Ні аб якой ініцыятыве і самадзейнасці калгаснікаў тут і гаварыць не прыходзіцца. Усё гэта падаўляецца грубым адміністраваннем **старшыні калгаса Собалева.** Даволі сказаць, што калгаснікі дагэтуль не ведаюць складу праўлення свайго калгаса. 31 жніўня ў праўленне калгаса былі кааптаваны новыя асобы, але дагэтуль іх кандыдатуры не абмяркоўваліся на агульным сходзе калгаснікаў. **Собалеў распараджаецца, як у сябе дома.** Без ведама калгаснікаў Собалеў распараджаецца калгасным дабром. Напрыклад, не спадабалася Собалеву печка ў канцэлярыі калгаса. Собалеў наймае мяснікa рабіць новую печ і расплочваецца з ім калгасным збожжам. Колькі выдана збожжа, нікому невядома. На пытанне калгаснікаў Собалеў адказвае: гэта не ваша справа. Малака і хлеба для сябе Собалеў бярэ колькі хоча, без усялякіх норм. Собалеў сваімі паводзінамі выклікаў абурэнне калгаснікаў, бо ён развальвае гаспадарку. Калгаснікі зварачаліся па гэтаму пытанню ў раённыя арганізацыі, але там не атрымалі ніякага адказу.

Такое-ж становішча і ў калгасе «Зара рэволюцыі», Бароўскага сельсовета (Менскі раён). Старшыня калгаса Іваноўскі,—піша калгаснік Унук,—зусім ігнаруе праўленне калгаса і калгаснікаў і распараджаецца калгасным дабром як сваім. Не гледзячы на тое, што ў калгасе ёсць лішкі рабочай сілы, Іваноўскі даручае вартаваць калгасную атаву млынару з суседняга млына Макацэвічу і за гэта дае яму 0,60 гектара атавы. Макацэвіч, будучы занятым на млыне, менш за ўсё думаў пра калгасную атаву, якая стоптвалася і знішчалася ўсякім, каму не лень. Нарэшце, Макацэвіч, скасіўшы свае 60 сотак, зусім адмовіўся ад ролі «вартаўніка». Тады Іваноўскі даручае вартаваць атаву зноў-такі не калгаснику, а аднаасобніку Гіблицкаму. Робіцца гэта без ведама праўлення, без ведама калгаснікаў.

Бескантрольнае распараджэнне калгасным дабром стала сістэмай Іваноўскага. Так, без ведама праўлення ён дазваляе сакратару Бароўскага сельсовета Бурко капаць калгасную бульбу.

Аб поўным ігнараванні асабістых інтарэсаў калгаснікаў піша селькор **З.** з калгаса «Камінтэрн», **Савіцкага сельсовета, Мазырскага раёна.** Вось характэрны прыклад. Калгаснік Якуш Мікола ў часе работы паранеў сабе вока. Якуш звярнуўся да старшыні калгаса Хармянчука з просьбай даць каня для паездкі ў больніцу. Хармянчук катэгарычна адмаўляе. Такія выпадкі ў гэтым калгасе не адзінкавыя.

Аб агідных фактах бяздушных адносін да калгаснікаў паведамляе тав. Знаючы з калгаса «Магутны», Ленінскага сельсовета, **Слуцкага раёна.**

«Брыгадзір калгаса Кананові ч адносіцца к калгаснікам па-зверску —піша т. З.—Некалькі раз прасіў я ў яго каня з'ездзіць да доктара. На мае просьбы я атрымліваю адзін адказ: каня табе не дам, а калі ты хворы, падавай заяву і выходзь з калгаса».

Кананові ч абыходзіцца так і з другімі калгаснікамі. Нядаўна, калі падымалі лён са сцеліч, ён збіў у часе работы адказную за лён калгасніцу Гусько Феню. Праўленне калгаса на гэта зусім не рэагуе. Аб крытыцы і самакрытыцы ў калгасе не прыходзіцца гаварыць. На сходах калгаснікі больш маўчаць, бо баяцца слова сказаць. Грубае ігнараванне інтарэсаў калгаснікаў, задушэ самакрытыкі адбіваецца на далейшым росце калгаса. Пачынаючы з 1933 г. у калгасе «Магутны» не ўступіла ні адна гаспадарка, у той час, як у другіх калгасах Ленінскага сельсовета наглядаецца значны прыліў.

Няўменне спалучаць асабістыя інтарэсы калгаснікаў з іх грамадскімі інтарэсамі, грубае адміністраванне і парушэнне прынцыпаў дэмакратыі ў калгасах з'яўляюцца значным тормазам у справе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацавання калгасаў і ператварэння іх у большэвіцкія.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЯЎРЭЙСКАЯ АЎТАНОМНАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ВОБЛАСЦЬ—ГОНАР СОВЕЦКАГА САЮЗА

А. Г. ЧАРВЯКОЎ

За 12 тысяч кілометраў ад Совецкай Беларусі на ўсходняй граніцы Совецкага Саюза, на новых неасвоеных прасторах Біробіджана, у казачнай краіне, поўнай невычарпальных раслінных, водных і выжлушных багацці, у краіне, маючай перад сабой бліскучыя гаспадарчыя перспектывы, за аўладанне якой ідзе шалёная барацьба капіталістычных акул усяго свету, створана па рашэнню комуністычнай партыі і совецкага ўрада новае дзяржаўнае ўтварэнне—Яўрэйская аўтаномная нацыянальная вобласць.

Усякі, хто прымусіць сябе ўважліва праўмаць гэтае мерапрыемства, павінен прызнаць яго найвялікшае палітычнае значэнне, яго грандыёзны гаспадарчы размах. Палітычнае значэнне стварэння Яўрэйскай аўтаномнай нацыянальнай вобласці выходзіць далёка за межы Совецкага Саюза. Толькі совецкі ўрад, ажыццяўляючы на справе ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку, знішчае ўсякую нярэўнасць сярод працоўных усіх нацыянальнасцей і аказвае магутнае неабходнае падтрыманне для іх гаспадарчага і культурнага сацыялістычнага развіцця. Толькі совецкі ўрад на аснове вучэння Леніна-Сталіна аб нацыянальным пытанні вырашыў до канца, так званае «яўрэйскае пытанне».

Ад спінінення «черты оседлости» з яе нечалавечымі здзекамі над яўрэямі ва ўмовах царызма да стварэння Яўрэйскай аўтаномнай нацыянальнай вобласці, як не адлучнай і роўнапраўнай часткі вялікага Совецкага Саюза—вось той бліскучы шлях рэволюцыйнай барацьбы і актыўнага сацыялістычнага будаўніцтва на аснове пасляўдоўнага ажыццяўлення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, які пройдзен яўрэйскімі рабочымі і працоўнымі масамі разам з рабочымі і працоўнымі ўсяго Совецкага Саюза пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі пасля Окцябрскай рэволюцыі.

Стварэнне Яўрэйскай аўтаномнай нацыянальнай вобласці красамоўна даказвае ўсяму свету, што задача, палітычнае і гаспадарчае вырашэнне якой на капіталістычных асновах аказалася не пад сілу капіталістычнаму свету, знайшла знайсці і знайшла сваё поўнае вырашэнне толькі на сацыялістычнай аснове ў совецкай дзяржаве.

Неабходна з усёй сілай падкрэсліць глыбокае інтэрнацыянальнае значэнне стварэння Яўрэйскай аўтаномнай нацыянальнай вобласці. Гэта мерапрыемства стварае яшчэ больш глыбокае, яшчэ больш моцнае інтэрнацыянальнае аб'яднанне працоўных усіх нацыянальнасцей у барацьбе за сацыялізм, у барацьбе супроць усякага прыгнечання, за поўную інтэрнацыянальную роўнасць усіх працоўных у барацьбе за стварэнне адзінага бясклассавага сацыялістычнага грамадства.

Стварэнне Яўрэйскай аўтаномнай нацыянальнай вобласці наносіць новы бязлітасны ўдар па вялікадзяржаўнаму шавінізму і па астатках чорнасоценнага антысемітызма. У той-жа час гэта мерапрыемства з'яўляецца новым ударам па яўрэйскаму нацыяналізму і клерыкалізму, бо яно яшчэ больш мабілізуе яўрэйскіх рабочых і працоўныя яўрэйскія масы на выкрышчэ контрэволюцыйнай сутнасці яўрэйскага, як і ўсякага, нацыяналізма і клерыкалізма, на бязлітасную ліквідацыю астаткаў іх уплыву сярод працоўных.

У той час, як у капіталістычных дзяржавах, якія заблыталіся ў невырашальных супярэчнасцях, знываюць пад ударамі найглыбейшага крызіса ўсёй капіталістычнай сістэмы, назіраецца новы выбух самага азвярэлага нацыяналізма, новы выбух заалагічнага антысемітызма, Совецкі Саюз, як граніцная скала стаіць сярод разбушаваўшайся стыхіі капіталістычных супярэчнасцей і яшчэ больш умацоўвае сваю магутнасць пасляўдоўным і цвёрдым ажыццяўленнем глыбока інтэрнацыянальнай, ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Стварэнне Яўрэйскай аўтаномнай вобласці ў Біробіджане мае таксама аграмаднае **гаспадарчае значэнне,** як адно з важнейшых мерапрыемстваў у справе барацьбы за сацыялізм, як адна з адказнейшых і **вялікіх задач другой пяцігодкі.** Стварыўшы Яўрэйскую аўтаномную вобласць, Совецкі Саюз ставіць перад сабой вялікую задачу —неадкладнага асваення горных, лясных, водных і глебавых невычарпальных багацццяў Далёкага Ўсхода, стварэнне магутных ачагоў сацыялістычнай гаспадаркі і культуры на Далёкім Усходзе.

У наяўнасці ўсе неабходныя прадпасылкі для паспяховага вырашэння гэтай вялікай задачы. Перад абвяшчэннем Яўрэйскай аўтаномнай нацыянальнай вобласці адбывалася доўгая падрыхтоўчая работа, якая заключалася ў тым, што ў Совецкім Біробіджане былі ўсебакова вывучаны клімат, прыродныя багацці, шырэ і зносін, магчымасці рассялення і т. д. і інш. У цяперашні час Совецкі Біробіджан у асноўным вывучан, што дае магчымасць неадкладна прыступіць да планавага разгортвання сацыялістычнай будоўлі як у галіне прамысловасці, так і сельскай гаспадаркі. Багацці совецкага Біробіджана агромадны: у гэтай краіне ёсць жалезная руда, каменны вугаль, золата, цэлы рад карысных чорных парод, багатая і рознастайная расліннасць, невычарпальныя рыбныя багацці і інш.

Вельмі важным з'яўляецца тое, што за мінулы час у Совецкім Біробіджане створаны і выхаваны нашай партыяй кадры энтузіястаў як з ліку карэнных жыхароў, так і з ліку піонераў-перасяленцаў яўрэйскіх рабочых, сялян і працоўных.

У Совецкім Біробіджане ўжо створаны асобныя ачагі сацыялістычнага будаўніцтва ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры, якія з'яўляюцца пунктамі апоры для далейшага ма гутнага разгортвання работы.

Слідам за апублікаваннем пастановы аб стварэнні Яўрэйскай аўтаномнай нацыянальнай вобласці ўрад Совецкага Саюза намеціў грандыёзны план будаўніцтва новых фабрык, заводаў, саўгасаў, калгасаў, новы план перасялення ў Совецкі Біробіджан. Такім чынам справа будаўніцтва Совецкага Біробіджана—Яўрэйскай аўтаномнай нацыянальнай вобласці аднесена да ліку важнейшых задач і з'яўляецца справай усяго Совецкага Саюза, з'яўляецца адной з важнейшых праблем другой пяцігодкі.

Совецкая Беларусь гаварыла стварэннем Яўрэйскай аўтаномнай нацыянальнай вобласці. Мы ганарымся за нашу вялікую партыю і правадыра нашай партыі таварыша Сталіна, які вядзе нас ад адной перамогі да другой па аснове пасляўдоўнага і цвёрдага ажыццяўлення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Стварэнне Яўрэйскай аўтаномнай нацыянальнай вобласці, ажыццяўляемае пад непасрэдным кіраўніцтвам тав. Сталіна, з'яўляецца бліскучым прыкладам пасляўдоўнага і пяўхільнага правядзення ў жыццё ленінска-сталінскай палітыкі.

Мы ганарымся за нашу вялікую сацыялістычную радзіму, вялікі Совецкі Саюз, які ставіць і вырашае задачы, што з'яўляюцца непасільнымі і невырашальнымі для капіталістычнага свету. Мы ганарымся тым, што Совецкая Беларусь прыняла непасрэдны і актыўны ўдзел у стварэнні Совецкага Біробіджана, што ў ліку піонераў-перасяленцаў Совецкага Біробіджана выдатнае месца займаюць яўрэйскія рабочыя, калгаснікі, спецыялісты, партыйна-совецкія кіруючыя работнікі з Беларусі.

Рабочыя, калгаснікі і ўсе працоўныя Совецкай Беларусі лічаць стварэнне і будаўніцтва Яўрэйскай аўтаномнай нацыянальнай вобласці кроўнай, роднай справай Совецкай Беларусі. Мы будуем і пабудуем у Біробіджане Яўрэйскую аўтаномную нацыянальную вобласць, як квітнеючы ачаг сацыялістычнай гаспадаркі і культуры на Далёкім Усходзе. Мы створым з Совецкага Біробіджана непрыступны фарпост на нашых далёка-ўсходніх межах.

Рашэнне совецкага ўрада аб стварэнні Яўрэйскай аўтаномнай нацыянальнай вобласці, як новы доказ росту, сілы і магутнасці Совецкага Саюза, знайшло гарачы водгук і ацэнку не толькі сярод працоўных Совецкага Саюза, але і сярод рабочых і працоўных усяго свету.

Усе прыцелі Совецкага Саюза лічаць справай гонару свой непасрэдны ўдзел у будаўніцтве Яўрэйскай аўтаномнай нацыянальнай вобласці.

Ворагі совецкай дзяржавы пастараюцца скарыстаць гэта рашэнне для ўмацнення сваёй барацьбы супроць рабочага класа. Гнусныя забойства аднаго з выдатных правадыроў нашай партыі і совецкай дзяржавы, аднаго з блізкіх прыяцеляў і сакратнікаў таварыша Сталіна — тав. Кірава Сергея Міронавіча—гаворыць аб тым, што ворагі совецкай дзяржавы карыстаюцца ўсякім выпадкам для таго, каб з-за вугла нанесці свае здрадзецкія ўдары.

Гэта перасцерагае нас ад недапушчальнасці хоць-бы малейшага аслаблення пільнасці ў барацьбе супроць нашых класавых ворагаў.

Стварэнне, будаўніцтва і росквіт Яўрэйскай аўтаномнай нацыянальнай вобласці яшчэ больш згуртуе рады рабочага класа і ўсіх працоўных Совецкага Саюза пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі ў барацьбе за сацыялізм, у барацьбе з усімі ворагамі рабочага класа.

Стварэнне Яўрэйскай аўтаномнай нацыянальнай вобласці — ёсць новая бліскучая старонка в гісторыі вялікіх перамог Совецкага Саюза ў барацьбе за сацыялізм, і мы ганарымся тым, што з'яўляемся актыўнымі ўдзельнікамі гэтай вялікай справы.

САКРАТАРЫ РАЙКОМАЎ КП(б)Б ПЕРАДАВЫХ РАЁНАЎ, ЗАНЕСЕНЫХ НА ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ

Злева направа: тт. РЫСКІН (Менск), ЖУРАЎЛЕЎ (Віцебск), СОСКІН (Орша), КАЦ (Сянно), КАРДАШ (Любань), БАЯРЧАНКА (Старобін), ФЕЛЬДМАН (Асіпавічы), БУРДЗІЛАЎ (Чырвоная Слабада), ЛІСКОВІЧ (Касцюковічы) і МАРГОЛІН (Чашнікі)

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА У БАРАЦЬБЕ ЗА ЗАМОЖНАЕ КАЛГАСНАЕ ЖЫЦЦЁ

БУРДЗІЛАЎ
сакратар Чырвона-Слабодскага РК КП(б)Б.

◆ ◆ ◆

ПЫГУН
старшыня Чырвона-Слабодскага РВК

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА

Выгнянская і Чапліцкая былыя воласці, на тэрыторыі якіх знаходзіцца цяперашні Чырвона-Слабодскі раён, у свой час выглядалі так: **40 проц. усёй зямлі належала памешчыкам Байніловічам, Крушынскім, Залеўскім, 30 проц. —кулакам Мастовічам, Сташкевічам ды іншым. На долю-ж працоўнага сялянства прыпадала не больш 20-25 проц. зямельнай плошчы, пры чым самай найгоршай па якасці.** Адсюль, як вынік, вострае беззямелле. Працоўны селянін прымушан быў ісці ў батракі або шукаць «шчасця» ў Амерыцы.

Ураджайнасць у сялянскай гаспадарцы не перавышала 20-25 пудоў з дзесяціны, і таму пераважная частка сялян прымушана была ад каляд купляць або пазычаць хлеб у кулака і пана на адработак.

Асноўнай крыніцай культуры тады тут з'яўлялася царква. Гэтых устаноў на тэрыторыі адной толькі Выгнянскай воласці налічвалася 13. Акрамя таго, былі 2 сінагогі і ў кожнай вёсцы карчма і манапольная. Школ-жа ўсяго 6. Отолькі-ж настаўнікаў. Не дзіва, чаму тут граматнага насельніцтва налічвалася толькі 14 проц.

Зусім іншая карціна зараз у Ч.-Слабодскім раёне. Паспяхова ажыццяўляючы мерапрыемствы партыі і совецкага ўрада, працоўныя Чырвонаслабодчыны, яе лепшыя ўдарнікі і арганізатары зусім змянілі твар гэтай мясцовасці. І лепшым паказальнікам гэтага з'яўляецца тое, што Чырвона-Слабодскі раён падыходзіць да VII з'езда советаў і да свайго раённага з'езда як адзін з перадавых раёнаў БССР. За паспяховае правядзенне гаспадарча - палітычных кампаній раён занесен на рэспубліканскую чырвоную дошку.

У бягучым годзе тут на 15 дзён раней мінулага года была закончана пасеўная, да 5 лістапада калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі выканалі свае абавязацельствы перад дзяржавай па здачы ільну. Трэцім у БССР раён закончыў хлебапастаўкі. Тая акалічнасць, што ў апошнія гады значна палепшыўся добрабыт шырокіх сялянскіх мас, калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі змаглі працаўдзяржаве, акрамя абавязковых паставак 1500 тон хлеба.

Такія паказальнікі гаспадарчай дзейнасці раёна з'яўляюцца вынікам перш за ўсё таго, што на месцы карлікавых, распыленых аднаасобных індывідуальных гаспадарак арганізаваны буйныя соцыялістычныя гаспадаркі — калгасы. Зараз раён калектывізаван на 64 проц. На аснове аб'яднання ў калгасы, пры дапамозе дзяржавы (МТС, рознастайныя ільготы і т. д.) працоўнае сялянства мае магчымасць лепш апрацоўваць зямлю, толькі за адзін бягучы год на 27 проц. пашырана пасеўная плошча, значна ўзрасла ўраджайнасць. Адзін гектар калгаснай зямлі дае ў сярэднім па раёну 13 цнт. збожжа і да 130 цнт. бульбы. А ў паасобных перадавых калгасах—«Трэці рашаючы», «Большэвік», «Новы будаўнік» і інш. — ураджайнасць дасягае 15-20 цнт. з гектара. У рэзультаце, ў сярэднім па раёну на адзін калгасны працадзень прыпадае не менш 3 клг. збожжа і 15 клг. бульбы.

Не меншыя поспехі мае раён і ў справе развіцця соцыялістычнай жывёлагадоўлі. Ажыццяўляючы рашэнні XVII з'езда партыі і ўказанні таварыша Сталіна, мы маем значны рост пагалоўя жывёлы. **Калі ў 1930 г. ў раёне налічвалася 9134 шт. буйнай рагатай жывёлы, то зараз ёсць 13263; калі ў 1932 г. свіное пагалоўе складала 12546 шт., то зараз—19462.** Прычым асноўны рост меў месца па калгаснаму сектару. За ўказаныя тэрміны па буйнай рагатай жывёле ў калгасах быў рост на 245 проц., а па свіному стаду—84 проц.

Да рэчы, гэта толькі колькасныя паказальнікі. Трэба мець на ўвазе, што павелічэнне стада, як правіла, суправаджаецца і яго палепшэннем. Нашы соўгасы Рачкавічы, Боркі-Бялевічы і Старчыцы, арганізаваныя на землях былых абшарнікаў, з'яўляюцца магутнымі рассаднікамі племянной і гатункавай жывёлы. Амаль у кожным калгасе можна знайсці вытворніка-быка, храка і гатункавы маладняк, атрыманы гэтымі калгасамі ад совецкіх гаспадарак.

Рост ураджайнасці, павелічэнне і палепшэнне стада як у калгасах, а таксама ў аднаасобным карыстанні калгаснікаў і аднаасобнікаў, у значнай ступені палепшыла добрабыт совецкага сялянства. Лепшым паказальнікам гэтага з'яўляюцца наступныя факты.

Калі да Окцябрскай революцыі ў гутэйшых вёсках амаль зусім не ўжывалася крамніна, не гаворачы ўжо аб скураным абутку, то зараз вясковы, у пераважнай большасці калгасны, спажывец патрабуе і купляе ў кааперацыі касцюмы, фасонныя польты, самавары, патэфоны, нікелеваныя ложкі, джэмпры, крэдэшэны, хромавы абутак.

Расце культурны стан совецкай вёскі, растуць яе культурныя запросы. У раёне працуе зараз 43 школы, з якіх 3 нацменаўскія і 13 няпоўных сярэдніх. **Раней, да Окцябра, у школах тут навучалася 300 дзяцей, а зараз 6010. Раней было 6 настаўнікаў, а зараз 192, з якіх 115 маюць вышэйшую і сярэднюю педагагічную асвету.** У раёне ажыццёўлена ўсеагульнае навучанне за пачатковую школу нават сярод дарослага насельніцтва.

Культурны стан раёна вызначаецца яшчэ і тым, што тут апрача школ ёсць 13 буйных дамоў соцкультуры, каля 100 дзіцячых дашкольных устаноў, якія ахапляюць звыш 2.000 калгаснай дзетвары.

За апошнія гады пабудаваны 3 электрастанцыі — адна ў раённым цэнтры, адна ў МТС і адна ў перадавым калгасе «Шлях Леніна». Упершыню раённы цэнтр абагачаўся брукаванай вуліцай, а раён—некалькімі лазнямі.

Культурны стан вёскі і рост палітычнай актыўнасці калгаснікаў мас вызначаюцца яшчэ і тым, што ў раёне на 6. 500 гаспадарак выпісваецца звыш 3.000 экз. рознастайных газет, не лічачы пяцітысячнага тыражу чатырох мясцовых друкаваных газет—адной раённай і трох палітадзельскіх.

Рост свядомасці і палітычнай актыўнасці шырокіх працоўных мас раёна характарызуюць такія паказальнікі: калі ў мінулай справаздачна-выбарчай кампаніі прымала ўдзел толькі 58 проц. выбаршчыкаў, то зараз 81. А хіба не паказальна тое, што ў апошнія гады нашы секцыі пры сельскіх советах налічвалі каля 800 чалавек пастаяннага арган'заванага актыву.

Вось з чым сустракае Чырвона-Слабодскі раён УП з'езд совецтаў. Не падлягае сумненню, што ўсе гэтыя поспехі былі дасягнуты толькі таму, што нашы сельскія советы пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі настойліва ажыццяўлялі мерапрыемствы совецкай улады, палітыку партыі Леніна, указанні таварыша Сталіна. Нашы лепшыя кіраўнікі пізавых органаў дыктатуры пролетарыята на вёсцы—перадавыя старшыні сельскіх советаў — т.т. Гарбавец, Прыма, Богамазаў і іншыя паказалі ўзоры большэвіцкай барацьбы па ўмацаванню калгасаў, па арганізацыі совецкага актыва.

Аднак, было-б зусім няправільна і шкодна захапляцца поспехамі і не бачыць недахопаў. **Мы не змаглі яшчэ выкарыстаць усіх магчымасцей у барацьбе за большэвіцкія калгасы,** за заможнае калгаснае жыццё. У нашых сельскіх советах і ў РВК былі і ёсць яшчэ не мала зрываў і непаладак у рабоце. Але мы не імкнемся замазваць іх, і на апоче большэвіцкай самакрытыкі ўскрыем кожны недахоп у сваёй рабоце, мабілізуем сябе на іх выпраўленне.

Наш лозунг—сёння працаваць лепш, чым учора, а заўтра—лепш чым сёння.

У наказе, што далі дэпутаты раённаму выканаўчаму камітэту, адзначан рад нашых памылак і недаробак. Адначасова наказ даў заданне сваім советам не спыняцца на дасягнутым і крочыць пераможна наперад. Пабудова новых электрастанцый, лазняў, школ, магазінаў, больніц і амбулаторый —вось, што лягло ў аснову наказу. А галоўнае—у бліжэйшы год дабіцца завяршэння калектывізацыі і арганізацыйна, на большэвіцкай аснове яшчэ больш замацаваць калектыўныя гаспадаркі.

Няма сумнення, што гэты наказ дэпутатаў—увасабленне волі шырокіх працоўных мас—будзе выкананы.

ГРЭЧЫЦ АЛЕСЯ
старшыня калгаса «Перамога», Чырвона-Слабодскага раёна.

„ЗАЖЫВЕМ ЯШЧЭ НЕ ТАК"

Вось ужо скора год, як я старшыня буйнога калгаса, які аднае 150 гаспадарак. Я маю гонар кіраваць адным з перадавых калгасаў, які прыходзіць да раённага з'езда советаў з надзвычнымі паказальнікамі работы. Мы закончылі мясапастаўкі, прадалі дзяржаве 30 тон хлеба і 30 тон бульбы. Заканчваем абмалот, надзялілі ўсіх бескароўных цёлкамі, выдалі калгаснікам на працадзень авансам па 1 кгр. збожжа і па 6 кгр. бульбы (усяго прыдзецца па 4 кгр. збожжа і 11 кгр. бульбы).

І калі я аб гэтым гавару, мне мімаволі прыходзіць у галаву думка: а што-б было з мяне, калі-б не совецкая ўлада?

Ёсць у нас у калгасе бабка Бялькевіч Ганна. Баявая бабуля—лепшая ўдарніца. Магла-б не толькі калгасам кіраваць, але і сельсоветам. Ды што, калі ў свой час ёй вучыцца не далі, і за чалавека не лічылі. Так і гібела жанчына каля печы свой век. Ды ці мала такіх? Такой-бы была і я.

Засталася я сіратою ад бацькоў, калі была мне гадоў 12. І думала я тады толькі аб тым, каб зарабіць сабе на хлеб.

Але, дзякуючы совецкай уладзе, я змагла сабе прабіць дарогу ў жыццё. У 1929 годзе ўступіла ў калгас. І з першага дня палюбіла я калгасную працу.

Калі я стала старшынёй калгаса, становішча маё было незайздроснае. Самы разгар падрыхтоўкі да вясны, а тут ураджай яшчэ не размяркован, коні худыя, на МТФ безгаспадарчасць, фахункавода трэба судзіць, ды на чале брыгад людзі ненадзейныя.

За што ўхапіцца? І рашыла я перш за ўсё згуртаваць вакол сябе надзейны актыў. Гэта мне дапамагло добра нападзіць работу ў калгасе.

Як член сельсовета, я ніколі не прапускала пасяджанняў прэзідыума, дапамагала праз сельсавет сваім вопытам адстаючым калгасам.

І хоць нялёгка давецца мне ўсё гэта, але-ж радасна, калі бачыш вынікі сваёй работы, калі ведаеш, што гэтыя вынікі з кожным годам лепшыя.

ГУЗМАН,
парторг калгаса «Шлях Леніна», член Жывалодаўскага сельсовета.

У КОЖНАЙ ХАЦЕ ЛЯМПАЧКА ІЛЬЧА

Вёска, дзе зараз існуе калгас «Шлях Леніна», яшчэ нядаўна, гадоў 5-6 таму назад, была тыповай палескай вёскай—шэрай, бруднай, нудная. І калі ў 1924 годзе тут арганізаваўся калгас і ўпершыню прыехаў трактар, стары селянін Санюкевіч упаў перад трактарам на дарогу і крычаў:

— Ні за што не пушчу гэтага гада на сваю палоску... Хай едзе праз мяне, праз маё мёртвае цела.

Ці варта казаць аб тым, што цяпер былы селянін Санюкевіч і ўся яго сям'я займаюць важнае месца ў радах калгасных ударнікаў.

Мне хочацца расказаць, як нашы калгасныя ўдарнікі змянілі выгляд сваёй шэрай вёскі.

Наш калгас мае 1100 га ворнае плошчы, на якой сумленна працуюць звыш 200 гаспадарак былых аднаасобнікаў.

І вось у рэзультаце гэтай працы не пазнаць цяпер нашай вёскі.

Раней на Палессі лазняў не было. Цяпер-жа мы маем у нашай вёсцы лазню з трох пакояў і вялікай раздявалкай. Мы купілі сабе дынаму і нафтавы рухавік і зараз наш калгас увечары за дзесяткі кілометраў убачыш. У кожнай калгаснай хаце, у доме соцкультуры, сельсавеце, у свірнах, кароўніках, канюшнях — усюды гараць лямпачкі Ільіча.

Больш таго, мы пачынаем скарыстоўваць электраэнергію на вытворчых працэсах.

У гэтым годзе калгаснікі настолькі сталі заможнымі, што прадалі дзяржаве 75 тон хлеба і купілі сабе за гэта аўтамашыну. І цяпер нашы калгасныя коні лёгка ўздыхаюць, калі трэба куды далёка перавозіць які-небудзь цяжкі груз.

У кожнай хаце вы знойдзеце гадзіннік, у лепшых — абоі, этажэркі, вазоны, веласіпеды. У кожнага калгасніка двое-трое свіней, 4—5 авечак.

Толькі гэта сапраўды заможнае жыццё, жыццё культурнае вясёлае дазволіла нам арганізаваць у сябе духавы аркестр з 18-ці асоб.

Добра цяпер жывецца калгаснікам у нашым калгасе.

А гэта толькі пачатак таго заможнага жыцця, аб якім нам казаў таварыш Сталін.

СІТНІЦА СА СКВАРКАЙ

Старшыня калгаса імя т. Войкава тав. Чайка толькі што вышаў з калгаснай канторы, а там ужо надрываецца — звоніць, кліча яго тэлефон. Ні то з раёна, ні то з сельсавета...

Людна, жыва і весела ў калгасе імя Войкава. Ля сцяны калгаснай канторы згуртавалася моладзь. Нехта з іх голасна чытае новую абвестку:

— Сёння ў памяшканні Бучаўінскай няпоўнай сярэдняй школы, роўна ў 8 г. вечара пачнецца кіносеанс «Абрэк Заур». Калгаснікам уваход бясплатны...

Стары дзед Ляксей казна: «О, цяпер жытка не тая, што калісь. Цяпер лепей... Бывала памалоціш са свае палоскі з паўсмены збажыны і веяць няма чаго... Так з гірсам у жорнавы і сыплеш... А цяпер хлеб белы ў нас, зрхаваны. Адным словам, сітніца...».

Стары моцна любіць калгас, асабліва таму, што тут яму, працавітаму дзеду, па густу работу далі: у дзень калгасныя склады ахоўваць —лёгка і пачесна.

А, бывала, у Бучаціне не тое было. Сітніцу елі ды лёгка рабілі толькі Сушчэвічы, што мелі па 20-30 га самай лепшай, ураджайнай зямлі, па 3-4 коней ды поўны хлеў кароў. А большасць—з пад жорнаваў ды з гірсам...

Сёлета ў калгасе імя Войкава адзін працадзень «важыць» 3 кг. адборнага зярна ды 15 кг. бульбы.

Сям'я калгасніка Лагуна Марка на шэсцера душ выраблла 950 працадзён. Папрабуйце падлічыць, колькі гэта хлеба ды бульбы прыдзецца... Чаму пасля гэтага сітніцу не есці. А каб ды не калгас, то далёка-б Лагуны не заехалі на сваіх двух дзесяцінах.

Або возьмем калгасніка Максіменю Мірона. Ён толькі сам адзін да 1-га снежня 420 працадзён выпрацаваў. І гэта—заслужаная ўзнагарода за яго працу. Працуе Мірон даглядчыкам на свіной ферме. І працуе не абы як. Ударна.

Максіменя Мірон не адзін. Такіх як ён у калгасе нямала. А таму і работа добра ідзе. Гэта-ж за адзін толькі мінулы год у калгасе імя Войкава пабудавалі новенькае гумно, кароўнік, канюшню, кузню і дапамаглі дзяржаве адбудаваць прасторнае і светлае памяшканне пад няпоўную сярэднюю школу.

А калгасная свінаферма. Хіба ёю не заслубуешся? Тут каля 300 гладкіх свіней, з якіх добрая палова адмеченых «іоркшыраў», выпеставаных сумленнай калгаснай працай.

Жыццёлагадоўляй у калгасе імя Войкава маюць права пахваліцца. Тут не толькі ў калгасным стадзе «іоркшыры», каровы-галанкі ды раманаўскія авечкі. Амаль у кожнага калгасніка побач з «тосканкай» гадуецца галанская пялушка, самазаваленка хрукаюць гатункавыя свінкі.

Весела і заможна пачынаюць жыць у калгасе.

ВІТ. ДАЛЬ.

ПІСЬМЫ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ

САКРАТАРУ ЖЛОБІНСКАГА РК КП(б)Б

РАЙКОМ, ЯКІ НЕ ПАВАЖАЕ СВАІХ УЛАСНЫХ ПАСТАНОЎ

(ПІСЬМО РАБОТНІКА РАЙГАЗЕТЫ)

Аб варожай дзейнасці старшыні калгаса «Чырвоны Жлобін» (Жлобінскі раён) **Фрадкіна** і загадчыка МТКФ **Фінкельштэйна** добра ведаюць райком партыі і палітаддзел МТС.

За разбазарванне калгаснага дабра, за здзекі з калгаснікаў (прымушванне калгаснікаў да сужыцця) бюро РК КП(б)Б пастанавіла Фрадкіна і Фінкельштэйна выключыць з партыі, зняць з работы і аддаць пад суд.

Аднак рашэнне бюро засталося толькі на паперы. Фрадкін і Фінкельштэйн як і раней працуюць на сваіх пасадах і праводзяць сваю варожую дзейнасць.

Для кармлення цялят было вылелена 200 пудоў канюшыны. Фінкельштэйн і Фрадкін раскрадваюць гэту канюшыну. Кожны дзень, везучы малако на маслазавод, Фінкельштэйн бярэ па 2 пуды канюшыны і адвозіць дамоў. Малако-перагон Фінкельштэйн раз мяркоўвае пам'ж сваімі знаёмымі.

Калі-ж, нарэшце, у Жлобіне будуць паважаць свае ўласныя пастановы?

П. КРЫШНЕЎ.

АД РЭДАКЦЫІ: Жлобінская раённая кіраўніцтва не зразумела таго, што вынесці пастанову, гэта толькі пачатак справы. Прыняўшы пастанову, трэба прасачыць, каб яна была выканана. Без гэтага траціць усякую вартасць пастанова, нават самая лепшая. І падрываецца аўтарытэт той арганізацыі, якая выносіць гэту пастанову.

«Звязда» чакае ад РК КП(б)Б тэрміновых мер па сутнасці пісьма т. Крышнёва.

СТАРШЫНІ ДЗЯРЖЫНСКАГА РВК тав. ВАНСОЎСКАМУ

КАЛІ-Ж ЗАКОНЧЫЦЦА БУДАЎНІЦТВА ШКОЛЫ?

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА)

Ужо 3 месяцы **Дзяржынская польская школа** працуе ў нясконча ным будынку.

Да гэтага часу не зроблены парадныя дзверы. Падвойныя вокны не ўстаўлены, а першыя рамы па крывіліся. Школьны двор не агароджан, няма памыйнай ямы і прыбіральні, адсутнічае электрычнасць. Кухню і сталовую зрабілі, але кладовай для хавання прадуктаў няма.

Загадчык комгаса т. **Ленчанка** аб хутчэйшым скончанні будаўніцтва не думае.

ТЫШКЕВІЧ.

СТАРШЫНІ ЧЭРВЕНЬСКАГА РВК тав. БУШМАНУ

ЗДЗЕКІ З РАБОЧАГА

(ПІСЬМО РАБОЧАГА)

Я, рабочы, маю 35-гадовы вытворчы стаж. У лютым гэтага года паступіў на працу ў соўгас «Маладая гвардыя», Лядзенскага сельсавета (Чэрвеньскі раён) у якасці слесара па рамонту сельскагаспадарчага інвентару.

Прапрацаваўшы 7 месяцаў, я захварэў і пралежаў у больніцы 47 дзён. Па выхадзе з больніцы вярнуўся зноў у соўгас.

Але там больш працаваць не прышлося. К майму прыходу ўжо быў адзан загад аб звальненні мяне з работы з прычыны дрэннага стану здароўя. Акрамя гэтага мне не выплацілі зароблату за 5 месяцаў, а таксама і па бюлетэню.

ГУРЫН.

САКРАТАРУ УЗДЗЕНСКАГА РК КП(б)Б тав. МАНЯК

ЗЛАДЗЕІ ЗАСТАЮЦЦА НЕПАКАРАНЫМІ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКАЎ)

У райгазеце «Калгаснік Уздзеншчыны» пад загалоўкам «Не рэагуюць» быў змешчан допіс аб тым, што старшыня калгаса «**Пролетарый**» **Цытко**, рахункавод **Тоўсты** і кладаўшчык **Пяткевіч** п'янствуюць за калгасныя грошы. Сігнал гэты застаўся пустым гукам.

Старшыня калгаса прысвоіў грошы за праданую салому, гуркі і інш. Жонцы сваёй Цытко прыпісаў лішніх 12 працадзён. Малако і масла знаходзіцца ў хаце старшыні калгаса, а па 6 літраў малака ён бярэ з калгаснай фермы.

Рахункавод Тоўсты за хабар калгасніцы Пяткевіч прыпісаў 2 працадні. Кладаўшчык Пяткевіч П. асуджан на 1 год прымусовых работ за зладзейства і падроб дакументаў, а з работы кладаўшчыка не знят і да гэтага часу.

Гэта тройка штодзённа ездзіць у мястэчка п'янствавацъ за калгасныя грошы. Бегаспадарчасцей у калгасе не пералічыць.

ПЯТКЕВІЧ М., ПЯТКЕВІЧ С., БУКА Я., БУКА П., ПЯТКЕВІЧ П.

НАРКОМУ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ тав. СУРТА

БОЛЬНІЦА БЕЗ ВАКОН І ДЗВЯРЭЙ

(ПІСЬМО САНІТАРКІ)

У 1930 годзе пачалі будаваць больніцу ў мястэчку Бачэйкава, Бешанковіцкага раёна. Але да гэтага часу будаўніцтва не скончылі.

У гэтым годзе па загаду РВК у незакончаным будынку адкрылі медпункт. Хворых прымаюць у пакоях без вакон і дзвярэй. Пасля ўсяго гэтага зусім не дзіўна, калі наведвальнікі медпункта прастуджваюцца і захворваюць.

Для заканчэння будаўніцтва больніцы мелася шкло, дзверы і інш. Але, з-за безгаспадарчасці загадчыка комунальнага аддзела **Рыскіна** ўсё раскрадзена.

СІНІЦКАЯ.

Па слядах пісем

„ТРАКТАРЫСТАМ НЕ ВЫПЛАЧВАЮЦЬ ГРОШАЙ"

Пад такім загалоўкам было змешчана пісьмо трактарыстаў Высачанскай МТС («Звязда» № 245, 1.XI 1934 года).

Начальнік палітаддзела Высачанскай МТС тав. **Стронгін** паведамляе, факт невыплаты трактарыстам грошай сапраўды быў. Зараз, у рэзультаце прынятых палітаддзелам мер, усе трактарысты зарплату за поўгода атрымалі, прымаюцца меры да поўнага разліку. Прыняты таксама меры да выпраўлення недахопаў у палічэнні працадзён. Урэгулявана пытанне з прадастаўленнем трактарыстам кватэр.

„ЯК У ПОЛАЦКУ РЭАГУЮЦЬ НА СІГНАЛЫ ДРУКУ"

Пад такім загалоўкам было змешчана пісьмо групы работнікаў райгазеты («Звязда» ад 15.XI.34 г.). У пісьме расказвалася аб разе фактаў ігнаравання пісем рабочых і калгаснікаў асобнымі арганізацыямі Полацкага раёна.

У адказ на гэта пісьмо сакратар Полацкага РК КП(б)Б тав. Турлай паведамляе «Звязде» наступнае:

«Бюро РК прызнала правільнай крытыку «Звязды» работы РК і другіх арганізацый раёна з пісьмамі працоўных.

Дырэктару Полацкай МТС Рэйнікаву і яго намесніку Краснову за перэгаванне пісем рабочых і калгаснікаў асобнымі арганізацыямі Полацкага раёна.

Дырэктару Ветрынскай МТС т. Асіноўскаму.

На указанне аб тым, што зацягваецца адвод зямлі ў нова-арганізаваным калгасе, прапанавана райвыканкаму прыняць неадкладныя меры да ліквідацыі гэтага з'явішча.

НОВАЕ СЕМЕЖАВА

Яшчэ задоўга да Окцябрскай рэвалюцыі мястэчка **Семежава** было добра вядома на ўсю ваколіцу. Тут быў паліцэйскі стан, была царква, манапольная ды ў хібарны гібела трохкрасная прыходская школа.

І былі яшчэ ў Семежаве «знатныя людзі»—поп, станавы прыстаў, ураднік, жандар, міраеды-кулакі—Мароз Аляксей, што меў 30 га пахаці, 9 коней, 12 кароў ды двух батракоў; Навіцкі Аляксей і інш.

Але яшчэ больш было тут галоты, што спрадвеку перабівалася з хлеба на квас.

Зусім не гэтым вядома Семежава і ўвесь сельсавет зараз, напярэдадні 11 усебеларускага з'езда совецтаў.

Нямала патрабавалася часу нашаму сельсавету, каб, робячы справаздачу перад сваімі выбаршчыкамі, расказаць аб тым, што зрабіла ў Семежаве совецкая ўлада.

Замест маленькай трохкласнай школы, дзе лінейкай, розгамі «навучалі» дзяцей пакарацца начальству, веравацъ у бога,—вырасла 10-гадовая совецкая школа. 850 дзяцей тут зараз навучаюцца. 19 настаўнікаў. Ёсць у Семежаве і нацыянальная яўрэйская школа, якая мае перарасці ў сямігодку. У гэтым годзе пабудавана памяшканне для 10-годкі.

Але гэта не ўсё: мы маем сваю больніцу, сваю аптэку і амбулаторыю, дзе кожны калгаснік і працоўны аднаасобнік можа ў любы момант атрымаць дапамогу. Цяпер тут няма чаго рабіць бабкам, шаптухам і знахарам. Ёсць у нас нядрэнны ветэрынарны пункт.

Сёлета ва ўсіх калгасах сельсавета ўраджай зернавых быў не ніжэй 13-14 цэнт. з гектара. У выніку гэтага, у калгасе імя XII-годдзя Окцября на адзін працадзень прыпадае 3, 5 кгр. збожжа, 14 кгр. бульбы; у калгасе «Трэці рашаючы»—4 кгр. зернавых і 16 кгр. бульбы. А раней на аднаасобных палосках тут самы працавіты гаспадар не ведаў лепшага ўраджаю, як 8-9 цэнтнераў з га. Вось што значыць калгасная праца, культурная апрацоўка глебы **МТС.**

Новае Семежава мае і новых сапраўдных знатных людзей. Мы можам ганарыцца сваім дырэктарам школы — **Храловічам,** доктарам **Жарскім,** ветдоктарам **Андруковічам,** старшынёй аднаго з лепшых калгасаў —імя дванаццацігоддзя Окцября — былым батраком **Сымонам,** лепшай ударніцай калгаса «Трэці рашаючы», членам прэзідыума сельсавета, калгасным брыгадзірам **Канак Марынай.**

Мы можам ганарыцца дзесяткамі лепшых ударнікаў, герояў калгаснай працы.

КАРАБАЎ,
старшыня Семежаўскага сельсавета.

ТАВАРЫШ ЛІТВІНАЎ АБ ФРАНКА-СОВЕЦКІМ ПАГАДНЕННІ

ЖЭНЕВА, 7 снежня. (БЕЛТА). Народны камісар па замежных справах тав. Літвінаў у гутарцы з карэспандэнтам ТАСС наступным чынам выказаўся па поваду новага франка-совецкага пагаднення ад 5 снежня:

«Толькі што падпісанае пагадненне з'яўляецца перш за ўсё доказам моцнасці і нязменнасці курса, узятага ўрадамі СССР і Францыі на далейшае ўзаемнае збліжэнне і міжнароднае супрацоўніцтва ў інтарэсах міру.

Яно, далей, гаворыць што, да рэчы, засведчана ў самым тэксце пагаднення, ад цвёрдай рашучасці абодвух урадаў прыкладаць далейшыя намаганні к рэалізацыі намечанага імі ўсходняга пакта, які яны прадаўжаюць лічыць істотным і незаменным фактарам стабілізацыі міру ў Еўропе. На гэта спецыяльна ўказваюць прынятыя на сябе абодвума ўрадамі абавязацельствы не даваць уцягнуць сабе ў перагаворы аб заключэнні якіх-бы там ні было пагаданняў, якія, пратэндуючы заняць месца ўсходняга пакта, на самой справе маглі-б сарваць тыя мэты, якія апошні сабе ставіць, або наогул зрабіць немагчымым гэты пакт ці аслабіць яго значэнне. Гэта значыць, што як Францыя, так і СССР прызнаюць, што няма ў сучасны момант магчымасці стварыць больш эфектыўныя гарантыі ці хоць-бы нават другія такія гарантыі, якія прадстаўлялі-б усходні пакт. Падпісанае пагадненне павінна таксама паказаць каму трэба бясспрэчнасць спроб адштурхнуць СССР або Францыю ад намечанага імі шляху, які вядзе к усходняму пакту, спроб, якія пры адсутнасці данага пагаднення здольны былі-б толькі сеяць недавер'е паміж абодвума краінамі, нічога не даючы па сутнасці ні таму ні другому боку ў якасці гарантыі стабільнага ўсеагульнага міру ў Еўропе.

Існуючыя ў сучасны момант перспэктывы міру не могуць быць устрашімы суб'ектыўнымі заявамі хоць-бы самага пацыфісцкага характару тых ці іншых даяржаўных дзеячоў, у асаблівасці, калі гэтым заявам процістаяць вусныя ці пісьмовыя, старыя ці новыя, зноў паўтараемыя, ці зноў распаўсюджваемыя заявы процілеглага характару. Патрэбны своечасова аб'ектыўныя эфектыўныя матэрыяльныя гарантыі для таго, каб усе народы маглі спакойна існаваць і прадаўжаць сваю ўшуктаную творчую работу.

Само сабой разумеецца, што заключанае цяпер пагадненне ніяк не выключае іншых пагаднення ў паміж СССР і Францыяй цяпер-жа або ў выпадку, калі ўсходні пакт па прычынах, незалежных ад узнаўляемых імі намаганняў, не ажыццёвіцца. Ніякіх абмежаванняў для двухбаковых пагаднення паміж СССР і Францыяй пратакол ад 5 снежня не змяшчае.

Ва ўсякім выпадку, якія пагадненні не былі заключаны паміж гэтымі двума краінамі, якія імкнуцца ні к чаму іншаму, як к узмацненню сваёй уласнай бязпасны і ўсеагульнага міру, гэтыя пагадненні ніколі не будуць накіраваны супроць інтарэсаў другіх краін, калі з гэтых інтарэсаў выключыць агрэсію. Я глыбока пераконан, што далучэнне да гэтых пагаднення другіх краін зрабіла-б узаемадзеянні паміж усімі ўдзельнікамі гэтых пагаднення аднолькавым ў лепшым сэнсе гэтага слова. У прыватнасці, СССР ніколі не пераставаў жадаць мець найлепшыя ўсебаковыя адносіны з Германіяй. Такое-ж, я ўпэўнен, і імкненне Францыі ў адносінах Германіі.

Усходні пакт зрабіў-бы магчымым стварэнне і далейшае развіццё такіх адносін паміж гэтымі трыма краінамі, таксама як і паміж другімі ўдзельнікамі пакта, і ўнёсбы тое супакаенне ў міжнароднае становішча, якога жадаюць народы Еўропы і Паўночнай Амерыкі.

Тым часам новае франка-совецкае пагадненне будзе, несумненна, процідзейнічаць хоць-бы далейшаму ўзмацненню існуючага неспакою, бо неабходна зразумець, што значэнне гэтага пагаднення не вычэрпваецца перыядам дыпламатычнай акцыі, звязанай з усходнім пактам.

Падпісанае ў Жэневе пагадненне палкам адпавядае тым мерапрыемствам, якія, як, напрыклад, толькі што закончанае вырашэнне саарскага пытання, маюць адзіную мэту —ахову міру».

ФРАНКА-СОВЕЦКАЕ ПАГАДНЕННЕ ВЫКЛІКАЛА НЕСПАКОЙ У БЕРЛІНЕ

ПАРЫЖ, 8 снежня. (БЕЛТА). Увесь друк змяшчае паведамленні аб гутарцы т. Літвінава з жэнеўскім карэспандэнтам ТАСС адносна падпісанага франка-совецкага пагаднення.

«Тан», адзначаючы значнасць гэтага пагаднення, указвае, што яно мае на ўвазе Германію, з якою СССР і Францыя абавязваюцца не заключаць ніякага палітычнага пагаднення, пакуль ідуць перагаворы аб усходнім пакце».

«Калі ўсходні пакт будзе падпісан,—гаворыць «Попюлер»,—то пагадненне страціць сваё значэнне. Калі-ж з-за варожасці Германіі і Польшчы ўсходні пакт не ўдасца ажыццявіць, то пагадненне адкрывае шлях к больш цеснаму франка-совецкаму супрацоўніцтву. Газета ўказвае, што рад актаў, як гутаркі прадстаўніка французскіх фашыстаў Гуа з Гітлерам, дэкларацыі фашысцкага дэпутата Скапіні і другіх,—выклікалі натуральны неспакой у Совецкім Саюзе. Усе гэтыя акты з'яўляюцца не толькі германафільскімі, але адначасова антысовецкімі.

Берлінскі карэспандэнт «Пары Мідзі» піша, што падпісанне франка-совецкага пагаднення выклікала ў берлінскіх колах поўны неспакой. У ім бачыць доказ таго, што франка-совецкія адносіны прадаўжаюць умацоўвацца і што Францыя не адмаўляецца ад усходняга пакта і зусім не лічыць лепшым двубаковае пагадненне.

Гавас перадае з Жэневы, што французскія афіцыяльныя колы ў Жэневе адносяцца з цікавасцю да дэкларацыі адносна франка-совецкага пагаднення, зробленай Літвінавым карэспандэнту ТАСС. «Тут канстатуюць,—гаворыць агенцтва,—што згодна заяўленням Літвінава, таксама як і згодна папярэднім заяўленням французскага друку, гэта пагадненне абмежавана як у часе, так і ў прасторы. У часе—таму, што яно дзеянне абмежавана працяжнасцю перагавораў, пачатых з мэтай заключэння пакта ўзаемадапамогі на ўсходзе Еўропы. У прасторы—таму, што гэта пагадненне мае на ўвазе выключна франка-совецкія ўзаемаадносіны і іх адносіны з паўнымі раёнамі Еўропы.

ПОЛЬСКІ ДРУК МАЎЧЫЦЬ

ВАРШАВА, 8 снежня. (БЕЛТА). Друк не выказваецца па поваду заключанага паміж Літвінавым і Лавалем пагаднення. Афіцыёз «Газета польска», змяшчае толькі тэлеграму берлінскага карэспандэнта, згодна якой якота, заключанае пагадненне прынята варожа берлінскімі палітычнымі коламі. Гэтыя колы, сцвярджае карэспандэнт, былі намераны адказаць на прапанову аб заключэнні ўсходняга пакта контрпрапановай гарантыйнага пакта паміж Францыяй, Польшчай і Германіяй.

Усебеларускі паход за асваенне мастацкай літаратуры

ДАДАТАК У НАКАЗ СЕЛЬСОВЕТУ АБ ЛІТАРАТУРЫ

На перавыбарчым сходзе вёскі **Лампекі** і **Дамашавічы (МАЗЫРШЧЫНА)** калгаснікі ўнеслі прапанову **ўключыць у наказ сельсовету пункт аб арганізацыі па калгасах гурткоў па вывучэнню мастацкай літаратуры.** Прапанова была аднадушна ўхвалена ўсімі прысутнымі. На бліжэйшым пасяджэнні прэзідыума сельсовета будзе прынят дэтальны план арганізацыі гурткоў.

Канкрэтна прыступіў да працы літаратурны гурток у калгасе **«Новыя Халоднікі».** Першая чытка кнігі **Шолахава** «Поднятая целина» адбылася 17 лістапада. Не гледзячы, што ў гурток запісалася толькі 25 чалавек, на чытках пры утнічае пераважная маса калгаснікаў, якія вельмі зацікавіліся кніжкай.

Створаны літаратурныя гурткі з комсамольцаў і беспартыйнай калгаснай моладзі ў калгасах **«Культура»** і **«Чырвоная Дуброва».** Пачалі чытаць «Спалох на загонах» **П. Галавача.**

Гэтымі днямі быў склікан злёт комсамольцаў і беспартыйнай моладзі пры палітаддзеле МТС па пытанню аб арганізацыі літаратурных гурткоў. На злёце настаўнік тав. **Ягур** паведаміў, што ў калгасе «Рухавік рэвалюцыі» ім арганізован гурток, у які запісалася 35 чалавек маладых калгаснікаў, акуратна прысутнічаючых на чытцы кнігі Шолахава «Поднятая целина». Пасля чыткі кожны раздзел абгаворваецца.

Тры раздзелы з кнігі «Поднятая целина» прачытаны ўжо ў калгасе **«Новы шлях»,** дзе гурткам з 20-ці калгаснікаў кіруе настаўнік тав. **Шарый.** Заканчваецца чытка і абгаворванне гэтай кнігі ў калгасе **«Новыя Дудзічы».**

На злёце прысутныя дагаварыліся арганізаваць 25 снежня канферэнцыю чытачоў кнігі Шолахава для масавага яе абгаворвання.

* * *

СЛУЦК. Комсамольская арганізацыя калгаса **«Памяць Ільіча»** наладзіла гурток па чытцы мастацкай літаратуры. У гурток запісалася 20 чалавек, Кіраўніком гуртка вылучылі настаўніцу. На сродкі калгаса закуплены кнігі «Мать», «Спалох на загонах», «Железный поток» і інш.

Звыш 30-ці калгаснікаў запісалася ў гурток, арганізаваны ў калгасе **«1 мая».**

* * *

КАСЦЮКОВІЧЫ. Райком КП(б)Б пастанавіў уключыцца ва ўсебеларускі паход за асваенне калгаснікамі мастацкай літаратуры. Для практычнага кіраўніцтва паходам створан штаб у складзе тт. **Рабзінка, Шмеркіна, Беленькага, Прахарэнкі, Калюты і Баранава.** Райком прапанаваў усім парторгам калгасаў і соўгасаў не пазней 5 снежня арганізаваць гурткі і вылучыць кіраўнікоў гурткоў з настаўнікаў і лепшых комсамольцаў. Раённая нарада кіраўнікоў гурткоў адбудзецца 10 снежня.

* * *

УЗДА. Райкомам і палітаддзелам МТС вылучан штаб па кіраўніцтву літаратурным паходам. У штаб увайшлі тт. **Сорэнзон, Цаткін, Розаў, Іапкоўскі, Чырман і Аронаў.**

* * *

СТАРЫЯ ДАРОГІ. 24-га лістапада адбылася раённая нарада кіраўнікоў гурткоў масавага чытання мастацкай літаратуры.

Масавае чытанне мастацкай літаратуры

Ініцыятары ўсебеларускага пахода за асваенне мастацкай літаратуры—працоўныя **Аршаншчыны** канкрэтна ўзяліся за арганізацыю гэтай справы ў калгасах раёна.

Мабілізаваныя райкомам і палітаддзелам упоўнаважаныя правялі па 24-х сельсоветах нарады настаўніцтва і вучнёўства для канкрэтнай арганізацыі гурткоў і кіраўніцтва імі. Масавае чытанне мастацкай літаратуры ўжо разгарнулася ў калгасах Панізоўскага, Крапіўненскага, Машкоўскага, Браздзечанскага, Гальцаўскага і Кудзеўскага сельсоветаў.

Надзвычай актыўна праходзяць заняткі ў літаратурным гуртку калгаса **«Ленінскі шлях»,** Браздзечынскага сельсовета. Пры чытцы аповесці **«Дрыгва»** Якуба Коласа ўдзельнічала шмат калгаснікаў, старых і маладых. Пасля скончэння чыткі аповесці было наладжана масавае абгаворванне прачытанага. Калгаснікам асабліва спадабаўся дзед Талаш, гераічны паход партызан на белапольскі абоз, збор партызанскай дружыны па сігналах пастушых труб і апошняя нераможная схватка з атрадам пана Крулеўскага.

Настаўніцтва і студэнцтва рабфака арганізавала паказальны гурток у калгасе **Ларынаўка,** Крапіўненскага сельсовета. Рабфак мабілізаваў у сябе патрэбную колькасць кніжак і вылучыў кіраўніком.

Сіламі педтэхнікума арганізованы гурткі ў Панізоўскім сельсавеце. Чыгуначны рабфак і настаўніцтва 8-й школы арганізавалі гурток на чыгунцы.

Па Барысаўскаму раёну на пабудову агітвяза імя III усебеларускага з'езда рабселькораў сабрана **1.101 руб.**

Рабкоры **шклозавода імя Домбаля** дадаткова ўнеслі 78 руб.

ГОРФІНКЕЛЬ.

Рэдакцыяй **«Брагінскай** газеты ўнесена **2.181 руб.**

ПЯЦЯРЭНКА.

Рэдакцыя газеты **«За большэвіцкі калгас»,** органа палітаддзела **Капыльскай** МТС, уносіць **812 руб.**

ШЭУЧЭНКА.

Рэдакцыя газеты **«Сталінскі заклік»,** палітаддзела **Горацкай МТС,** уносіць **201 руб.** Збор сродкаў прадаўжаецца.

ЗЕЛЬТЦЭР.

Рэдакцыяй лепельскай рённай газеты **«Калгасная праўда»** на пабудову агітсамалёта імя 3-га ўсебеларускага з'езда рабселькораў сабрана 1150 руб. Збор сродкаў прадаўжаецца.

БАРОЎСКІ.

На пабудову агітвяза імя III усебеларускага з'езда рабселькораў па **Клімавіцкаму** раёну сабрана і ўнесена ў Беладдзяленне Дзяржбанка **1.100 руб.**

МІНАЎ В.

Рэдакцыя газеты **«Комуніст»** (Бабруйск) уносіць на пабудову агітвяза **255 руб.**

Рэдакцыя **лепельскай** раённай газеты **«Калгасная праўда»** уносіць на пабудову агітвяза імя III усебеларускага з'езда рабселькораў **1.150 руб.**

БАРОЎСКІ.

Селькоры калгаса **«Бязбожнік»,** Вунаўскага сельсовета, Лёзненскага раёна, уносяць **327 руб.**

Рэдактар **ШАБРАКА.**

Рабочы калектыў соўгаса **«Цімкавічы»,** Капыльскага раёна ўносіць на пабудову агітвяза 715 руб. Збор сродкаў прадаўжаецца.

ТРЫБУШЭЎСКІ.

* * *

З пачатку збору ў фонд пабудовы агітвяза імя III ўсебеларускага з'езда рабселькораў паступіла **42.100 руб.**

ШАХМАТНЫ ЧЭМПІЯНАТ СССР

7 снежня ў Ленінградзе адкрыўся розыгрыш першынства СССР па шахматах. Апрача чэмпіёна СССР т. Батвінніка, заслужанага майстра спорта т. Рамановскага і пераможцы тыфліскага турніра майстроў т. Голідзе ў Ленінградзе прымаюць удзел усе лепшыя ігракі СССР.

У парадку чарги іграюць: Дубінін, Чаховер, Левенфіш, Рабінавіч і., Алатарцаў, Лісіцын, Юдовіч, Кан, Багатырчук, Рагозін, Мазель, Белавенец, Верасаў, Румін, Макагонаў, Ільін-Жэнеўскі, Папоў, Фрэйман, Раузер і Савіцкі.

ПЕРШЫ ТУР

Выйгралі: Савіцкі ў Дубініна, Алатарцаў ў Ільіна-Жэнеўскага, Кан у Верасава. Нічыё: Лісіцын-Макагонаў, Юдовіч—Румін і Рагозін — Мазель. Астатнія партыі не закончаны.

ДРУГІ ТУР

Выйгралі: Багатырчук у Верасава і Ільін-Жэнеўскі ў Лісіцына. Нічыё: Румін—Кан і Макагонаў—Юдовіч. З адкладзеных перавага ў Мазеля, Белавенца і Алатарцава.

ТЭАТР

Беларускі дзяржаўны ТРАМ перад сезонам

Пасля трохмесячнай напружанай вучобы ў Ленінградзе Беларускі даяржаўны тэатр рабочай моладзі рыхтуецца пачаць у снежні бягучага года свой першы тэатральны сезон у Менску.

Вучоба калектыва трама ў ленінградскім тэхнікуме, у лепшых педагогаў і майстроў тэатральнага мастацтва (у прыватнасці работа над вучобнай класічнай камедыяй Мольера «Тарцюф» у перакладзе К. Крапівы, з вядомым рэжысерскім знатаком французскага тэатра прафесарам В. Н. Салаўёвым) паказала, што актор трама ўжо сур'ёзна пачынае ўзброівацца тэхнікай сцэнічнага мастацтва, яна паказала нам такіх талантлівых маладых акторaў як **Глікман С. М.** — Тарцюф, **Яноўская Л. І.** — Эльміра, **Бараноўскі А. А.** паж Перцель, **Скакун Б. В.** — Доміс, **Міхайлаў Л. П.** — Оргон, **Краўчанка Е. І.** — Дарына і інш.

Чым тэатр пачне свае выступленні?

Ужо два месяцы як вядзецца рэжысерам **М. А. Зоравым** і ўсім калектывам разгорнутая работа па ажыццяўленню пастаноўкі **«Працяг будзе»** А. Брушцейна ў афармленні маладога мастака **Сонкіна** і кампазітара **М. Іванова.** Бяручы на сябе такую адказнейшую работу як адкрыццё і паказ тэмы «Наступленне фашызма і рост рэвалюцыйнай свядомасці працоўных мас Германіі», калектыў Беларускага трама з усёй сур'ёзнасцю і адказнасцю адносіцца да гэтай пастаноўкі.

У гэтай рабоце Беларускі даяржаўны трам павінен паказаць, як ён прадаўжае і спалучае тую вучобу, якую ён праходзіў у ленінградскім тэхнікуме сцэнічнага мастацтва, і створыць цікавы культурны спектакль як у сэнсе творчага росту актора, так і ў сэнсе мастацкага і ідэйнага росту ўсяго тэатра.

Улічваючы свае ранейшыя памылкі, Белардзяржтрам упершыню над гэтай работай прыцягнуў групу прафесіянальных актораў Г. П. Глебаў, Е. Э. Міронаву, М. Ф. Рэкел, Б. Л. Аляксеенка, Ф. С. Міфедава, якія практычна будуць дзяліцца вопытам з маладым трамаўскім калектывам і дапамогуць яму ў аўладанні культурай прафесіянальнага тэатра.

Апрача маючайся вучэбнай класічнай пастаноўкі «Тарцюф» Мольера і «Працяг будзе» А. Брушцейна, праца над якой падыходзіць к канцу, Белардзяржтрам пакажа яшчэ ў гэтым сезоне «Адважны трус» — камедыя Штока і Смаляна, падрыхтоўчая работа над якой ужо тэатрам пачата; новую п'есу Б. Мікуліча з жыцця моладзі Совецкай Беларусі, якую ён піша па дагаворанасці з тэатрам і класічныя п'есы О. Бальзака «Гавань бур».

Пастаноўкай «Працяг будзе» А. Брушцейна і камедыяй Мольера «Тарцюф» Беларускі даяржаўны тэатр рабочай моладзі ўпершыню ў снежні 1934 г. адкрывае свой тэатральны сезон, уключаючыся ў рады функцыянальных прафесіянальных тэатраў БССР.

Справа Наркомасветы забяспечыць тэатр памяшканнем для работы і пастаянным рэжысерам, бо без гэтага немагчыма нармальная планавая работа і творчы рост маладога калектыва.

ВЛ. СТЭЛЬМАХ.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

10-XII-34 г. у 7 гадзін веч. у Доме партактыва адбудзецца чарговы пропсемінар для прапагандыстаў партыйнай сеткі: СПШ, марксісцка-ленінскіх гурткоў, кандыдацкіх школ, пачатковых школ па ленінізму, гурткоў беспартыйных рабочых і КСМ палітшкол.

Дом партактыва пры Менгарконе КП(б)Б.

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

Па Совецкай Беларусі

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПЕРАПІСУ ЖЫВЁЛЫ

Нядаўна ў старшыні Совета Народных Камісараў БССР тав. **Гандзева М. М.** адбылася нарада аб правядзенні практычнай работы на месцах па перапісу жывёлы.

На нарадзе прысутнічалі: кіраўнік народна-гаспадарчага ўліку БССР т. **Владзіміраў,** нам. наркома земляробства т. **Стрэле,** нам. наркома асветы т. **Ляшчынскі,** прадстаўнікі Дзяржплана і інш.

На нарадзе вырашана: прыцягваць мыя да ўдзелу ў перапісе настаўнікі вызваляюцца ад працы ў школах тэрмінам з 20 снежня 1934 г. па 20 студзеня 1935 г. Аб гэтым будзе дана належнае ўказанне. Наркомасветы раённым аддзелам асветы.

У дапамогу раёнам з Менска пасылаюцца тэрмінам на два месяцы 10 адказных работнікаў з апарата ўліку цэнтральных устаноў.

Усе студэнты інстытута народнай гаспадаркі, якія выязджаюць 10-га снежня на практычную работу ў раёны, будуць выкарыстаны ў якасці абследвальнікаў у соўгасах, а некаторая частка з іх—у якасці кіраўнікоў перапісу.

На заводзе імя Молатава вырабляюцца настольныя більярды. На здымку: токар па дрэву выточвае шар для більярда.

* **РАМОНТНЫ ЦЭХ** для рамонту помпаў і студняў арганізуецца пры трэсце Водаканалізацыя.

ЗНІЖЭННЕ ЦЭН НА ЦУКАР

Наркаматам гандлю БССР устаноўлены новыя раздробныя цэны на камерцыйны цукар.

З 10 снежня ва ўсёй раздробнай сетцы даяржаўнага гандлю і спажывецкай кааперацыі ўстанаўліваецца цана на цукар-рафінад 7 руб. 50 кап. за кіло і на цукар-пясок 6 руб. 50 кап.

МЕНСКІ РАЁН ЗАКОНЧЫЎ БУЛЬБАЗАКУПКІ

Менскі раён на 10 снежня закупіў 3.049 тон бульбы, перавыканаўшы на 49 тон першапачатковыя намёткі.

Старшыня аргбюро Менскага РВК ТУРЭЦКІ.

КААПЕРАЦЫІНЫ ГАНДАЛЬ ХЛЕБАМ У РАЁНАХ

СНК БССР дазволіў Белкаапсаюзу з сёнешняга дня арганізаваць свабодны гандаль печаным хлебам па камерцыйных цэнах у Слуцку, Клімавічах, Быхаве, Асіпавічах, Хойніках, Дзяржынску і Горках.

* **ЛЕГКАВАЯ МАШЫНА** выдзелена Менскай цэнтральнай рабочай паліклініцы для абслугоўвання неадкладнай і кансультацыйнай дапамогай хворых на дому.

Гамош. БДТ—1 Беларускі дзяржаўны тэатр Оперы і Балета
Тэл. 24905
Мастацкі кіраўнік І. А. ГІТТАРЦ
опера
Сёння, 10 снежня
для значкістаў ЗОТ і ударнікаў
СЕВІЛЬСКІ ЦЫРУЛЬНІК
у 3 дзеях.
Пастановка рэж. Ольгі Барысевіч.
Мастак Шкляеў.
Пачатак у 8 гадз. вечара.
Заставшыяся білеты ў касе тэатра.

Гукавы кінотэатр „Пролетарый"
Гукавы мастацкі фільм
ЧАПАЕЎ

Кіно „Інтэрнацыянал"
Мастацкі фільм
ДЭК БРЫЗТЫ

АДКРЫТ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на 1935 год
„ЛІТЕРАТУРНАЯ ГАЗЕТА"
орган праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў СССР і РСФСР—15 нумароў у месяц.
У газеце аддзелы: за рубяжом, тэатр і кіно, мовазнаўства, крытыка і бібліяграфія і т. д. Дасцца ствараецца інфармацыя аб літаратурным жыцці Масквы, Ленінграда і перыферыі.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: 12 мес.—30 руб., 6 мес.—15 руб., 3 мес.—7 руб. 50 кап.
„ЛІТЕРАТУРНОЕ НАСЛЕДСТВО"
6 нумароў у год.
„ЛІТЕРАТУРНОЕ НАСЛЕДСТВО" ставіць сваёй задачай сістэматычную і планамерную распрацоўку матэрыялаў па гісторыі літаратуры, грамадскай мысці і журналістыцы як рускай, так і замежнай.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: 12 мес.—42 руб., 6 мес.—21 руб.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: Масква, 6 Страстной бульв., 11, „Жургазобъединение", інструктарамі і ўпаўнаважанымі Жургаза і ўсюды поштай і аддзяленнямі „Саюздрука".
ЖУРГАЗОБ'ЕДИНЕНИЕ.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".
СЁННЯ, 10 СНЕЖНЯ, апошні дзень на нашым экране
гукавы мастацкі фільм
ЧАПАЕЎ
У праграме: тэрміновы выпуск Саюзкінохронікі
Дзень гневу і жалобы. | Пахаванне т. С. М. КІРАВА.
Пачатак сеансаў у 5-30, 7-15, 9 і 10.40. | Каса з 1 гадз.

МЕНГАРТОП
даводзіць да ведама ўсіх трымальнікаў талонаў на дровы як пайшчыкаў, так і ўстаноў і прадпрыемстваў, што
з 10 снежня праводзіцца
АБМЕН ТАЛОНАЎ на новыя
як шурачныя, так і вагонныя.
Па старых талонах з 11 снежня водпуск дроў спыняецца.
Абмен талонаў праводзіцца ў канцылярыі Гартопа—Пляц Волі, 4, з 18 да 22-х гадзін.
Тэрмін абмену да 1 студзеня 1935 г.
Пасля гэтага тэрміну ўсе неабмененыя талоны будуць лічыцца несапраўднымі.
Для ўдобства рэкамендуецца ўстановам і прадпрыемствам абмяняць талоны для пайшчыкаў калектыўна, праз ФЗМК.
ГАРТОП.

СЁННЯ у 8 гадз. веч., у намяшк. 5-й поўнай сярэдняй школы (Ленінская, 21) адбудзецца
АГУЛЬНЫ СХОД НАСТАЎНІКАЎ ВЯЧЭРНІХ ШКОЛ З КУЛЬТРАБОТНІКАМІ
прадпрыемстваў і культармейцамі па пытанню правядзення 15-годдзя дэкрэта Леніна аб ліквідацыі непісьменнасці.
Яўка абавязкова і без спазнення.
МЕНГАРАНА.

Беларускі дзяржаўны медыцынскі інстытут
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ЎСІХ СТУДЭНТАЎ-ВЫПУСКНІКОЎ
медінстытута, якія знаходзяцца зараз на раёне, што яны
павінны 10-XII г. г. усе з'явіцца ў Медінстытут для дыпломнай работы.
Дырэкцыя.

АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1935 г.
на ўсе перыядычныя выданні выдавецтваў „ОГИЗ'а"
1. Сацыяльна-эканамічныя.
2. Комсамольскай і юнацкай літаратуры.
3. Ваенныя.
4. Мастацкія.
5. Сельскагаспадарчыя.
6. Вучэбна-педагагічныя.
7. Фізкультэліт Яны.
8. Дзіцячыя.
9. Музычныя.
10. Бібліятэчна-бібліяграфічныя.
11. Транспартныя.
12. Совецкае заканадаўства.
13. „Физкультура и туризм".
14. Выяўленчых мастацтваў.
15. Крытыка і бібліяграфічны.
16. Па харчовай прамысловасці.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА аддзяленнямі, магазінамі, кіёскамі, упоўнаважанымі „КОГИЗ'а" і ва ўсіх паштовых пунктах БССР.
Патрабуйце праспекты і каталагі „КОГИЗ'а".
Аддзел падпісн. і перыяд. выд. Беларускага аддзялення „КОГИЗ'а".
МЕНСК, СОВЕЦКАЯ, 41-12 тэл. 23—709.

У мэтах папулярызацыі законаў, правіл і норм гандлю, устанаўляемых цэн
з снежня м-ца 1934 г. пачынае выходзіць не радзей 5 раз у м-ц
„ГАНДЛЁВЫ БЮЛЕТЭНЬ"
ВЫДАННЕ НАРКОМУНУТГАНДЛЮ БССР.
У „Гандлёвым бюлетэні" будуць асветлены наступныя пытанні:
а) пастановы, распараджэнні ўрадавых органаў па пытаннях гандлю і снабжэння;
б) прайс-куранты цэн, змены ў цэнах, накідкі і т. п.;
в) весткі аб попытах і прапанове на рынку тавараў;
г) кансультацыі па гандлёвых пытаннях;
д) заключаныя праз Беларускую кантору попыту і прапаноў розныя здзелкі;
е) кан'юнктурныя агляды і іншыя матэрыялы па совецкай гандлёвай палітыцы і палітыцы цэн.
Усе гандлюючыя арганізацыі горада і раёнаў БССР павінны падпісацца на „ГАНДЛЕВЫ БЮЛЕТЕНЬ", які вызваляе іх ад перадрукавання розных матэрыялаў.
Падпісная цана 5 руб. у месяц.
Падпісную плату накіроўвайце ў Наркомунутгандаль, пакой 407, тав. Вранцу.
НАРКОМУНУТГАНДАЛЬ БССР.

ПЛАН ВЫБАРЧЫХ СХОДАЎ

менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў на 10 снежня.

№ выб. участкаў	Выбарчы участак (назва прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый)	Ліч. выбарш.	Час сходу	Месца сходу	Упаўнаважаны
201	Дзіцячая налітэхнічная станцыя, Інстытут павышэння кваліфікацыі, соўпартшкола, пабудова Ленпартгарадка, станцыя механізацыі сельскай гаспадаркі	150	20 г.	Ленпартгарадок (выстаўка)	Дэйч
202	Менская фабрычна працоўная калонія (адм.-тэхнічны персанал)	204	19 „	Клуб прац. калоніі	Клебанаў
203	Арцелі: імя Фрунзе, „Беларусь", „Зацільжыркосць" «Чырвоная зорка», „Фотатруд", „Праплюстра", „Пабеда", „Чырвоны друкар", „Субтэхнікі", апарат бытсаюза, страхкаса, Белхарчпромсаюз	545	19 „	Клуб прапасветы (Комуністычная вул.,)	Шолкаў
208	Арцелі: імя Крупскай, „Пролетарый", „Новы шлях", „Ватаканат" і апарат Чынтэкстыльшэйпромсаюза	950	17 „	Клуб імя Сталіна	Іпатаў
209	Утрыманцы па ЖАКТ'ах № № 57, 58, 59, 60 ЖБКТ „Саюзтрансавец, ЖБКТ „Чырвоны чыгуначнік"		18 „	Клуб 13-гіоддзе	Партной
210	Утрыманцы па ЖАКТ'ах № 24 і 25	350	18 „	Клуб Эльвода	Астроўскі

Выпускаючы — КРУЧКОЎ, ст. рэдактар — БЯРОЗАВІК, ст. мантэр пяк — ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпёр—КАГАН, ст. друкар АНУЧЫН. Тыраж 89.010. Уп. Галоўлітбела № К—6318.
Менск, друкарня «Звязды».